ЧАМУ ГАЛОЎКІ СЫРУ — ГЭТА ЗЛІТКІ ЗОЛАТА?

МС

ВЕРА Ў ТВОРЧАСЦЬ

21

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ВЕРАСНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 187 (29301)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег ШВЕЦ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:

«Было прынята правільнае рашэнне ва ўмовах пандэміі не спыняць работу будаўнічага комплексу. Нашы суседзі закрывалі граніцы, спынялі работу прадпрыемстваў, але Беларусь — маленькая краіна, у нас няма, напрыклад, энергарэсурсаў, і калі б мы спыніліся, то гэта негатыўна адбілася б на многіх галінах і кірунках эканомікі. А ва ўмовах жорсткай канкурэнтнай барацьбы мы б проста страцілі рынкі збыту. На ўзроўні бударганізацый мы прынялі меры, праз якія не распусцілі людзей, не страцілі рынкі. Мы здолелі гэта ўсё захаваць».

Прыгожы спорт, прыгожыя спартсмены

Фота БелТА.

Анастасія ТРАКІМАЙТЭ з Магілёва і яе грацыёзны сябар — удзельнікі адкрытага чэмпіянату па конным спорце (трохбор'і), які праходзіць гэтымі днямі ў Гомелі.

КАРАТКА

• Новай старшынёй Беларускага саюза жанчын выбрана Алена Богдан.

• Беларускія школьнікі заваявалі тры медалі на міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы IOI-2020.

• ДАІ ўзмоцніць кантроль на аўтадарогах Мінскай вобласці 25—27 верасня.

• Выканкамы будуць самастойна запытваць дакументы для 85 адміністрацыйных працэдур.

• Сярэдні заробак у Беларусі ў жніўні склаў Br1276,4.

• Першы этап Кубка свету па лыжных гонках пройдзе без гледачоў.

• «Мінсктранс» аднаўляе штодзённыя аўтобусныя рэйсы ў Рыгу з 1 кастрычніка.

Здароўе: практычны падыход

«ТЭРАПІЯ АДЧАЮ» ЦІ БУДУЧЫНЯ МЕДЫЦЫНЫ?

Для лячэння якіх захворванняў выкарыстоўваюць ствалавыя клеткі ў нашай краіне

Клетачныя тэхналогіі, або так званае лячэнне ствалавымі клеткамі, прымяняюцца ў беларускай медыцыне адносна нядаўна. Каля дзесяцігоддзя таму пачалося яго выпрабаванне, і ўсяго некалькі гадоў методыку выкарыстоўваюць для лячэння пацыентаў. Асноўныя напрамкі, дзе прыжылася клетачная тэрапія, — неўралогія і траўматалогія, а таксама анкалогія. Усяго каля тысячы хворых прайшло клетачную тэрапію ў нашай краіне. Спецыялісты расказалі, якіх вынікаў дасягнулі, чаму такое лячэнне называюць «тэрапіяй адчаю» і па якіх прычынах ствалавыя клеткі непажадана прымяняць для амаладжэння.

У анкалогіі, імуналогіі і стаматалогіі

Клетачная тэрапія рэкамендавана для лячэння каля 70 захворванняў. У Беларусі яе апрабавалі для трох дзясяткаў хвароб.

СТАР. 5

ЖЫЦЦЁВЫ СТРЫЖАНЬ

У складанай жыццёвай сітуацыі апынулася педагог з Гомеля Таццяна БОЙНІЧАВА. Год таму жанчына стала ахвярай жудаснай аварыі. Цяпер яна перасоўваецца на інваліднай калясцы, а кожны выезд з пад'езда — цяжкае і небяспечнае выпрабаванне. Пры садзейнічанні дэпутатаў для з'езду з першага паверха на вуліцу ў пад'ездзе зроблена спецыяльная пляцоўка, на вуліцы ёсць пандус. Але сітуацыю можа выратаваць толькі механічны пад'ёмнік. Па папярэдняй ацэнцы «Гомельліфта» яго кошт каля 10 тысяч рублёў. Сям'я Таццяны Бойнічавай спадзяецца на дапамогу ўсіх неабыякавых людзей, а таксама гарадскіх улад.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

ПРА СУПРАЦОЎНІЦТВА І НЕ ТОЛЬКІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з паслом Кітая

Нагодай для размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом КНР Цуй Цымінам стала заканчэнне яго кадэнцыі ў нашай краіне і ўзнагароджванне ордэнам Пашаны.

«Сёння ў нас не святочная нагода для сустрэчы, калі пасол з'язджае з краіны. Прытым добры пасол, які шмат зрабіў, каб адносіны развіваліся ў неабходным ключы, як мы планавалі са старшынёй Сі Цзыньпінам. Нам застаецца спадзявацца, што пасля вас прыедзе пасол не горшы, хацелася б лепш, але лепей наўрад ці бывае. Вы вельмі шмат зрабілі для нашых адносін», — сказаў Прэзідэнт перад тым, як уручыць Цуй Цыміну ордэн Пашаны, указ аб чым падпісаў у аўторак.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў перадаць старшыні КНР Сі Цзыньпіну словы падзякі за падтрымку.

«Ён першы павіншаваў мяне з перамогай на выбарах, ды і ўсе найбуйнейшыя дзяржавы нашай планеты, за выключэннем асаблівасцяў Захаду. Захад заўсёды ў нас быў з асаблівасцямі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Перадайце яму (Сі Цзыньпіну. — **«Зв.»**), што ў Беларусі ў яго сябры. ***Беларусь заўсёды будзе сяброўскай краінай для Кітайскай Народнай Рэспублікі.*** Раскажыце яму пра тую канструктыўную пазіцыю, якую займаюць асобныя дзяржавы ў адносінах Беларусі. Асабліва, што дзіўна, суседзі. ***Суседзі ад Бога, іх не выбіраюць, і нам наканавана жыць разам, сябраваць, але аказваецца не заўсёды так».***

Прэзідэнт пракаментаваў скаргі краін, што Беларусь не аб'явіла аб інаўгурацыі. «Па законах Беларусі мы нікога не павінны папярэджваць. Гэта ўнутраныя справы нашай краіны. Крытыка толькі адна: не тое тайна, не тое таінства», — акцэнтаваў увагу кіраўнік краіны.

Ён растлумачыў, што на цырымонію былі запрошаны разам з ваеннымі каля 2000 чалавек і захаваць у тайне гэта было фактычна немагчыма.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, уступленне Прэзідэнта на пасаду можа крытыкавацца толькі, калі яно праведзена не па законе. Як ён дадаў, тут усе нормы выкананы.

«Каму трэба было ведаць пра гэта, ведалі. Трэніроўкі, падрыхтоўка пэўны час займае, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Наступны раз мы будзем старацца нашых суседзяў папярэджваць. Я маю на ўвазе палякаў, літоўцаў пра нейкія буйныя мерапрыемствы».

Прэзідэнт растлумачыў, што на гэтым прыкладзе дэманструе адносіны заходніх краін да суверэнітэту краіны.

«Крычаць пра тое, што нешта не прызнаюць у нас. Вы ведаеце, мы нікога не прасілі прызнаваць ці не прызнаваць нашы выбары, прызнаваць легітымнасць зноў абранага Прэзідэнта ці не прызнаваць. ***Галоўнае, каб гэта адпавядала Канстытуцыі нашай краіны,*** — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Я не надаю інаўгурацыі цяперашняга Прэзідэнта (гэта не першая мая інаўгурацыя) вялікага, фантомнага значэння. Звычайная рабочая сітуацыя. Чаму яны гэта робяць? Для таго, каб падагрэць пратэсныя настроі, каб больш вываліла на вуліцу ў суботу, нядзелю людзей».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў, каб пасол Кітая далажыў у МЗС КНР і старшыні КНР аб сітуацыі, якая складваецца ў нашай краіне. Таксама Прэзідэнт падзякаваў Цуй Цыміну за садзейнічанне ў павелічэнні тавараабароту, барацьбе з каранавірусам.

«Вы нам паставілі два станкі па тэхналогіі вытворчасці ахоўных масак. Мы сёння можам любую колькасць вырабіць. Але самае галоўнае: мы былі ў пастаянным кантакце з вашымі ўрачамі, якія першымі сутыкнуліся з гэтай заразай і пастаянна нас інфармавалі, якім чынам нам змагацца з гэтай бядой», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Як ён рэзюмаваў, ордэн Пашаны — гэта заслужаная ўзнагарода за асабісты ўнёсак пасла ў развіццё адносін і павага Беларусі да Кітая.

Марыя ДАДАЛКА.

Ва ўрадзе

ДЗЕЦЯМ НЕ МЕСЦА Ў ПАЛІТЫЦЫ

26 бацькоў, якія былі на несанкцыянаваных мітынгах з дзецьмі, прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці

Пра ўдзел дзяцей у пратэсных акцыях сёння ішла размова на чарговым пасяджэнні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, створанай пры Савеце Міністраў. Па словах намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Ігара ПЕТРЫШЭНКІ, дзеянні бацькоў, якія ўцягваюць дзяцей у несанкцыянаваныя мітынгі, пярэчаць міжнародным прававым нормам, дзеючаму закону аб правах дзіцяці, шэрагу артыкулаў Кодэкса аб шлюбе і сям'і.

«Мы прааналізуем сітуацыю, якая склалася, шэраг рашэнняў былі прыняты ў рамках камісій па справах непаўналетніх. Ёсць адпаведныя даручэнні, і гэтыя камісіі займаюцца канкрэтнымі абставінамі. На разглядзе каля 280 спраў адміністрацыйнага вядзення па парушэнні непаўналетнімі правілаў паводзін і ўдзелу ў несанкцыянаваных мітынгах», — сказаў намеснік прэм'ер-міністра.

У яго выклікае шкадаванне, што складваецца ўражанне, быццам бацькі стараюцца прыкрыцца дзецьмі: «Ні адзін праваахоўнік, ні адзін гуманітарны фонд, якія так дбаюць аб затрыманых на акцыях, не выказаў сваёй занепакоенасці парушэннем правоў непаўналетніх. Складваецца ўражанне, што ўсе гэтыя дзеячы не бачаць парушэнняў, мабыць, ім гэта і не цікава. Больш цікава рабіць фэйкавыя навіны».

Як адзначыў Ігар Петрышэнка, яго непакояць факты, калі цяжарныя жанчыны ўдзельнічаюць у несанкцыянаваных мерапрыемствах, як было ў Гродне. «Мяне здзіўляе: дзяржава дае аплачваемы 126-дзённы бальнічны ліст да родаў і пасля іх для таго, каб маці захавала сваё здароўе і здароўе дзіцяці. То-бок дзяржава плаціць ёй грошы, а яна ўдзельнічае ў тым, каб нанесці шкоду дзяржаве», — канстатаваў намеснік прэм'ер-міністра.

Ён расказаў, што адказнасць бацькоў за ўцягненне дзяцей у несанкцыянаваныя мітынгі стане больш жорсткай. «Адпаведныя прапановы дадзены, каб паглядзець і прааналізаваць магчымае ўвядзенне ці пашырэнне ступені адказнасці бацькоў за прыцягненне дзяцей да несанкцыянаваных мерапрыемстваў. Мы аналізавалі, такая практыка ёсць у Расіі, Казахстане, іншых краінах. Мы таксама падыходзім да таго, каб ініцыяваць, уносіць гэта пытанне. Для нас раней такая сітуацыя была нестандартная, у нас не было неабходнасці ўводзіць такую адказнасць. Бачна, што бягучая сітуацыя дыктуе неабходнасць жорсткіх мер», — канстатуе намеснік Прэм'ер-міністр.

Але асноўны акцэнт робіцца на прафілактычную работу, бо, па словах Ігара Петрышэнкі, прыцягнуць бацькоў да адказнасці — не мэта. Асноўная задача, каб бацькі супыніліся, задумаліся, «уключылі галаву і беражліва сваіх дзяцей, не ўцягвалі ў сумнеўныя мерапрыемствы».

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

Кітай паважае выбар беларусаў

Беларускі народ пад кіраўніцтвам Прэзідэнта здольны самастойна забяспечыць палітычную стабільнасць і бяспеку ў сваёй краіне, лічыць старшыня Камітэта па замежных справах, кіраўнік кітайска-беларускай групы дружбы Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан ЕСУЙ. Аб гэтым ён заявіў падчас сустрэчы з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў, кіраўніком рабочай групы Нацыянальнага сходу па супрацоўніцтве з парламентам КНР Валерыем МІЦКЕВІЧАМ у фармаце відэаканферэнцсувязі.

«У Беларусі і Кітая давернае ўсебаковае стратэгічнае супрацоўніцтва. Кітай заўсёды паважаў шлях развіцця, абраны беларускім народам, і намаганні, накіраваныя на абарону незалежнасці, суверэнітэту, бяспекі і развіцця краіны. Мы выступаем супраць спроб знешніх сіл пасеяць разлад і хаос у беларускім грамадстве», — сказаў Чжан Есуй.

Ён даў высокую ацэнку намаганням беларускіх калег па развіцці адносін з Кітаем, прасоўванні супрацоўніцтва паміж парламентамі. Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі пытанні далейшага развіцця кітайска-беларускіх адносін па лініі заканадаўчых органаў дзвюх краін, умацавання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, узаемнай падтрымкі ў міжнародных справах, сумеснага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі.

«Мы высока цэнім падтрымку Кітая, у тым ліку ў пытаннях павагі замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. Выказваем удзячнасць КНР за канструктыўную пазіцыю адносна сітуацыі ў Беларусі, якая адстойваецца на міжнародных пляцоўках, уключаючы Савет Бяспекі ААН. Мы з цвёрдым аптымізмам глядзім на развіццё беларуска-кітайскіх адносін і ўпэўненыя ў паслядоўнай рэалізацыі ўсіх планаў, — сказаў Валерый Міцкевіч падчас сустрэчы. — Перакананыя, што візіт старшыні КНР Сі Цзыньпіна ў Беларусь надасць дадатковы магутны стымул двухбаковаму супрацоўніцтву. Мы гатовыя да цеснага ўзаемадзеяння з парламентам Кітая ў справе яго падрыхтоўкі і арганізацыі».

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла Макарына-Кібак у размове з журналістамі адзначыла важнасць гуманітарнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. «Кажуць, сябар пазнаецца ў бядзе. Зусім нядаўна прайшла першая хваля каранавіруснай інфекцыі. Калі мы даведаліся, што ў кітайскага боку ўзніклі праблемы з медыкаментамі, па распараджэнні Прэзідэнта Беларусі першымі ў свеце накіравалі нашым сябрам у КНР самалёты з медыцынскай гуманітарнай дапамогай. Калі COVID-19 прыйшоў у Еўропу, Кітай дапамагаў нам з тэст-сістэмамі і іншым медыцынскім абсталяваннем, ахоўнымі сродкамі. Таму лічу, што ўзаемадзеянне групы дружбы вельмі важнае і актуальнае», — падкрэсліла яна.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Дзярждоўг ЗША павялічваецца

Да 2050 года дзяржаўны доўг ЗША вырасце ў два разы — з 98 працэнтаў ВУП у 2020-м да 195 працэнтаў. Такая аналітыка прыводзіцца ў дакладзе бюджэтнага ўпраўлення Кангрэса, перадае РІА «Навіны». У студзені мяркуемы паказчык заставаўся на ўзроўні 180 працэнтаў, аднак эканамічны крызіс, звязаны з пандэміяй каранавіруса, і цяперашняя грашова-крэдытная палітыка прымусілі пагоршыць прагнозы. Эксперты заклікалі падрыхтавацца да таго, што ўжо налета дзярждоўг на фоне росту дэфіцыту бюджэту выйдзе за межы 100 працэнтаў, а ў 2022-м дабярэцца да 107 працэнтаў, што стане самым высокім паказчыкам у гісторыі краіны. У дакументе адзначаецца, што хуткасць росту гэтага важнага эканамічнага паказчыка ўяўляе сур'ёзную пагрозу для краіны. Такая тэндэнцыя павышае рызыку павелічэння ставак па крэдытах, што, у сваю чаргу, затармозіць развіццё эканомікі, павялічыць магчымасць крызісу і занепакоіць інвестараў.

У Канадзе пачалася другая хваля каранавіруса

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр краіны Джасцін Трудо. Ён папярэдзіў, што Канаду чакае сур'ёзны ўсплёск захваральнасці на COVID-19, калі жыхары не будуць прытрымлівацца рэкамендацый спецыялістаў у галіне аховы здароўя, паведамляе Reuters. У спецыяльным тэлезвароце, які транслявалі ўсе нацыянальныя тэлеканалы, Трудо адзначыў, што другая хваля каранавіруса назіраецца ў чатырох буйных правінцыях Канады — Альберта, Брытанская Калумбія, Антарыа і Квебек. «Сітуацыя восенню можа быць нашмат горшая, чым была вясной», — адзначыў ён. Прэм'ер заклікаў канадцаў насіць маскі, часцей мыць рукі і выконваць сацыяльную дыстанцыю, скарачэнне колькасці кантактаў да мінімуму. Акрамя гэтага, паведамляе канадскі тэлеканал Global News, Трудо параіў жыхарам загрузіць мабільную праграму, якая паведамляе карыстальніку, калі той знаходзіўся ў кантакце з хворым на каранавірус. Колькасць новых выпадкаў COVID-19 у Канадзе апошнім часам рэзка ўзрасла: у сярэднім штодня рэгістравалася звыш тысячы новых выпадкаў, пры гэтым яшчэ ў сярэдзіне жніўня фіксавалася каля 380 заражаных.

У Турцыі з'явіўся асабліва небяспечны від камароў

У гэтай краіне зафіксавана хуткае распаўсюджванне азіяцкага тыгровага камара, які можа пераносіць такія захворванні, як жоўтая ліхаманка і вірус Зіка. Вялікая колькасць небяспечных насякомых была выяўлена ў раёнах Стамбула, хоць раней яны не з'яўляліся на тэрыторыі краіны. Даследчыкі мяркуюць, што згаданы від здольны лёгка адаптавацца. «Гэты від атакуе на працягу ўсяго дня, асабліва калі чалавек знаходзіцца на адкрытым паветры. Ён нашмат агрэсіўнейшы, чым іншыя камары», — паведаміў дацэнт Стамбульскага ўніверсітэта Керэм Этэра. Як адзначыла турэцкая газета HabberTurk, акрамя рызыкі заразіцца падобнымі захворваннямі, укус азіяцкага тыгровага камара небяспечны тым, што выклікае павышаную алергічную рэакцыю.

Па законе

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПРАВАПАРАДАК

Генпракуратура ініцыюе прыняцце дадатковых мер па стабілізацыі сітуацыі ў краіне

Аб гэтым заявіў генеральны пракурор Андрэй ШВЕД перад пачаткам каардынацыйнай нарады па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй, перадае БелТА.

«Яе асноўная мэта — сумесна з праваахоўным блокам, іншымі кампетэнтнымі органамі і арганізацыямі выпрацаваць тактыку і стратэгію дзеянняў па рэалізацыі даручэнняў кіраўніка дзяржавы і забяспечыць правапарадак у краіне, — падкрэсліў Андрэй Швед. — Праблемныя пытанні ўзаемадзеяння ўсіх дзяржаўных органаў у дадзеным становішчы, асабліва ў частцы грамадскай бяспекі, нам добра вядомыя. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне мае скаардынаванасць нашай працы. Яна павінна быць накіраваная на апярэджанне падзей і мець канкрэтны практычны вынік у найбліжэйшы час».

Генеральны пракурор вызначыў некаторыя важныя кірункі для канцэнтрацыі намаганняў. «Першае — мэтанакіраваная праца па забеспячэнні няўхільнасці пакарання арганізатараў і актыўных удзельнікаў пратэсных акцый, кампенсацыі прычыненага ўсімі вінаватымі матэрыяльнага ўрону. Праваахоўныя і іншыя дзяржаўныя органы працуюць над высвятленнем усіх грамадзян, якія здзейснілі супрацьпраўныя дзеянні ці парушылі грамадскі парадак за перыяд з 9 жніўня. У гэтай частцы намечаны і будзе рэалізаваны комплекс дадатковых мер па актывізацыі работы. Вызначаны дакладны алгарытм узаемадзеяння для ўстанаўлення сум нанесенай у ходзе незаконных масавых мерапрыемстваў шкоды і парадак іх спагнання. Падыход адзін: прыйшоў на несанкцыянаваную акцыю — будзеш пакараны рублём. І сумы гэтыя вельмі істотныя», — адзначыў ён.

Другі кірунак — абарона правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх, уцягнутых бацькамі і іншымі асобамі ў незаконныя масавыя мерапрыемствы. «Органам унутраных спраў даручана неадкладна выяўляць такіх асоб і звесткі пра іх перадаваць у органы апекі і папячыцельства або пракурорам для прыняцця ўсіх законных мер уздзеяння, каб не дапусціць падобных фактаў у далейшым. Трэцяе — вызначаны формы і метады работы шэрагу дзяржаўных органаў, накіраваныя на выяўленне і спыненне любых відаў парушэнняў закона з боку моладзі, асабліва ва ўстановах адукацыі. Запатрабавана ўзмацніць прафілактычную і ідэалагічную работу ў маладзёжным асяроддзі», — дадаў Андрэй Швед.

Генеральны пракурор падкрэсліў: «Ні адзін блогер, ні адна асоба, якая ўчыніла злачынства не толькі на несанкцыянаваных мерапрыемствах, але і ў інтэрнэце, не сыдзе ад адказнасці. Сёння вядзецца вельмі актыўная работа па выяўленні такіх асоб і прыцягненні іх да адказнасці. У бліжэйшыя некалькі месяцаў грамадскасць даведаецца пра вынікі гэтай работы з дапамогай адкрытага судовага разгляду шэрагу крымінальных спраў, дзе з улікам атрыманых бясспрэчных доказаў вы пераканаецеся ў тым, што праваахоўныя органы толькі будуць нарошчваць свае намаганні па спыненні і выяўленні падобнага роду злачынстваў і правапарушэнняў».

«Што датычыцца агульнай злачыннасці, сітуацыя абсалютна кантралюемая. Наадварот, мы адзначаем зніжэнне агульнай крымінальнай злачыннасці па большасці саставаў злачынстваў. Гэта сведчыць, што праваахоўныя органы разам са складанымі задачамі, выклікамі і пагрозамі, якія вырашаюць цяпер, не забываюць і спраўляюцца з тым, што злачыннасць знаходзіцца пад поўным і жорсткім кантролем, — сказаў Андрэй Швед. — Што датычыцца грамадскага парадку ў сталіцы і іншых населеных пунктах, вы бачыце — сітуацыя кантралюемая. З кожным днём яна паляпшаецца».

Падпіска-2020

ДА СУСТРЭЧЫ Ў БАБРУЙСКУ!

«Звязда» працягвае ладзіць сустрэчы з чытачамі ў розных рэгіёнах Беларусі. Гэтым разам мы накіроўваемся ў адзін з самых каларытных куткоў не толькі Магілёўшчыны, а бадай што і ўсёй Беларусі — старажытны Бабруйск.

Дзень падпісчыка адбудзецца ў рэгіянальным вузле паштовай сувязі, што на вуліцы Мінскай, 21. Мы чакаем тут вас сёння з 11 да 15 гадзін. У гэты час можна не толькі аформіць падпіску на ўсе выданні Выдавецкага дома «Звязда», але і атрымаць таксама памятныя падарункі. Завітайце — будзе цікава!

Блізкая ўлада

ПЫТАННІ? ПРАБЛЕМЫ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, **26 верасня,** з 9.00 да 12.00 правядуць:

✓ кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

✓ намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

✓ намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

✓ намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

✓ старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ. Тэл. 8 022 250 18 69;

✓ старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

✓ старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Спорт

У беларускай лёгкай атлетыкі новы кіраўнік

24 верасня на пазачарговай канферэнцыі грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі» старшынёй федэрацыі быў абраны Іван Ціхан. Яго кандыдатуру прапанаваў экс-старшыня Вадзім Дзевятоўскі: «Я хачу прапанаваць на пасаду чалавека, які для мяне як брат, — гэта Іван Ціхан. Ён як ніхто іншы ведае, што такое цяжкасці. На Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра ён паказаў усім, «дзе ракі зімуюць». За кандыдатуру Івана Ціхана прагаласавала 68 дэлегатаў канферэнцыі, супраць — 1.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Свой заўчасны сыход з пасады Вадзім Дзевятоўскі, які ўзначальваў федэрацыю лёгкай атлетыкі з 2014 года, растлумачыў станам здароўя: «Я жыў праблемамі лёгкай атлетыкі, я ведаў душы нашых спартсменаў. Я кожную хвіліну думаў, што зрабіць яшчэ, каб мы былі найлепшыя. І арганізм даў збой, мне неабходна аднаўленне. Гэта вымушаная мера, мне не хочацца спыняць наш хуткі тэмп працы. Апошнія гады лёгкая атлетыка гучыць часцей, мы бачым, як растуць вынікі нашых чэмпіёнаў, як развіваецца дзіцячая лёгкая атлетыка. Гэта сігнал для нас усіх, што зроблена вялікая праца і пасеяны зярняткі, якія будуць даваць плады. Я ўпэўнены, што задачы, пастаўленыя перад федэрацыяй, будуць выкананы. А я, як толькі вырашу ўласныя праблемы, пастараюся вярнуцца».

Вадзім Дзевятоўскі і Іван Ціхан — слаўтыя лёгкаатлеты-малатабойцы. Былы старшыня федэрацыі — чэмпіён свету ў штурханні молата, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў — 2008, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Новы старшыня Іван Ціхан плануе сумяшчаць кар'еру кіраўніка федэрацыі і спартсмена. Зараз ён рыхтуецца да Алімпійскіх гульняў у Токіа, якія стануць для яго шостымі. На алімпіядзе 2008 года ў Пекіне ён заваяваў бронзу, а ў 2016 годзе ў Рыа-дэ-Жанэйра — серабро.

«Я буду старацца апраўдваць ускладзеныя на мяне абавязкі. Спадзяюся, што гэта зробіць мяне мацнейшым. Я ўпэўнены, што камандай федэрацыі, нашай нацыянальнай камандай, абласнымі аддзяленнямі мы зможам зрабіць многае. Мы павінны быць адзінай сям'ёй, якая вырашае свае праблемы разам. І мы дапаможам Вадзіму Анатолевічу хутчэй усё вырашыць і вярнуцца. Будуць новыя праекты, будуць працягнуты тыя, што ўжо ёсць. Мы будзем імкнуцца знаёміць кожную сям'ю з лёгкай атлетыкай», — адзначыў Іван Ціхан.

Валерыя СЦЯЦКО.

Будзь у курсе!

Прызначаны новы цягнік

У мэтах павышэння ўзроўню транспартнага абслугоўвання насельніцтва Беларуская чыгунка з 27 верасня да 26 кастрычніка прызначыла новы цягнік, які па нядзелях і панядзелках звяжа тры абласныя цэнтры — Гомель, Магілёў і Віцебск.

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, цягнік № 697/698 будзе адпраўляцца з Гомеля па нядзелях у 17.16 і прыбываць у Віцебск у 23.26. У адваротным кірунку з Віцебска цягнік адправіцца ўжо пасля поўначы — у 1.00 панядзелка і ў 7.36 прыбудзе на станцыю Гомель. Па дарозе састаў зробіць прыпынкі на станцыях Буда-Кашалёўская, Жлобін, Рагачоў, Быхаў, Магілёў, Шклоў і Орша.

Кошт праезду ў плацкартным вагоне ад Гомеля да Віцебска складзе 10,96 рубля, а ў купэйным — 15,20 рубля.

Падрабязнасці аб раскладзе і кошце праезду можна даведацца праз мабільны дадатак «БЧ. Мой цягнік», на сайце pass.rw.by, а таксама па нумары 105 кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Надвор'е

СПАЧАТКУ ВЕТРАНА, ПОТЫМ ХОЛАДНА

Калі ў суботу будзе прыпякаць — да плюс 27 градусаў, то ў сераду максімум — 11—18 цяпла

Найбліжэйшыя дні верасня яшчэ пацешаць нас сапраўдным цяплом, аднак у выхадныя камфортнасць надвор'я парушыць моцны парывісты вецер, а на наступным тыдні пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу тэрыторыя краіны застанецца ў цёплай паветранай масе, удзень на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па заходнім рэгіёне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы чакаецца ад 9 цяпла па ўсходзе да плюс 17 градусаў па захадзе краіны, удзень будзе 21—27 цяпла.

Пад уплыў атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з тэрыторыі Украіны, мы трапім у нядзелю. Уначы па паўднёвым захадзе, удзень на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. У многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 цяпла, удзень — ад плюс 17 градусаў да плюс 23.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні тэмпературны фон пачне паступова паніжацца і наблізіцца да звычайнага для канца верасня значэнняў. У панядзелак уначы на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы будзе ад 7 да 14 цяпла, удзень — плюс 13—20 градусаў. Кароткачасовыя дажджы прагназуюцца ў аўторак і сераду. Тэмпература паветра ў аўторак уначы складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль, удзень — плюс 13—20 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны — да 22 цяпла.

Пераломам надвор'я на восень сіноптыкі чакаюць ужо ў сераду. Максімальная тэмпература ўдзень складзе 11—18 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Сенатары за работай

ДАСТУПНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ

Некаторыя аспекты карэкціроўкі праекта закона «Аб ахове здароўя»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці сустрэўся з калектывам Гродзенскага абласнога перынатальнага цэнтра і адказаў на пытанні карэспандэнта «Звязды».

Што датычыцца законатворчай дзейнасці, у найбліжэйшы час будзе разглядацца карэкціроўка па ўнясенні змяненняў у праект закона «Аб ахове здароўя», паведаміў Віктар Лісковіч. Мяркуецца, што змены закрануць многія аспекты, каб палепшыць якасць і даступнасць медыцынскай дапамогі.

Будуць вызначаны так званыя апорныя бальніцы ў кожным рэгіёне, што дазволіць сканцэнтраваць матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы для аказання ўсіх відаў медыцынскай дапамогі ў блізкай дасягальнасці. Па-першае, пацыент павінен трапіць у бальніцу на працягу адной гадзіны, а па-другое атрымаць дапамогу на ўзроўні рэспубліканскіх цэнтраў. Такім чынам, не трэба будзе чакаць сваёй чаргі на нейкае планавае абследаванне ці аперацыю ў цэнтральных клініках сталіцы.

Будзе ўзаконена функцыянаванне ўніверсітэцкай клінікі як пілотнага праекта. Такі новы статус атрымае Гродзенская абласная бальніца, на базе якой гэты працэс і пачаўся.

Значнае месца адводзіцца інфарматызацыі. Лічбавы кірунак дапаможа мець поўную базу аб пацыентах. Гэта дазволіць своечасова прыняць рашэнне, а таксама разгрузіць медыцынскіх работнікаў ад афармлення дакументаў. Такім чынам, яны больш часу змогуць удзяліць непасрэдна пацыенту.

Паралельна з гэтым законам ідзе яшчэ адзін — аб лекавых сродках. Дэпутаты разгледзяць прапановы, якія закранаюць парадак увозу лекавых сродкаў, іх рэгістрацыю. Напрыклад, увоз патрэбных лекаў будзе ажыццяўляцца па кароткай схеме. Прадугледжаны яшчэ цэлы шэраг новых палажэнняў, якія скіраваны на даступнасць і якасць медыцынскай дапамогі. Праект мяркуецца разгледзець яшчэ да канца гэтага года.

На сустрэчы з калектывам Гродзенскага абласнога перынатальнага цэнтра гаворка ішла аб падтрымцы іміджу медыцынскага работніка. І супрацоўнікі ўстановы з гэтым паспяхова спраўляюцца. Штогод тут прымаецца звыш трох тысяч родаў, больш за 20 гадоў няма мацярынскай смяротнасці, пры тым што сюды трапляюць і пацыенткі з ускладненнямі. Тут застаўся касцяк калектыву і вельмі нізкая цякучасць кадраў. Віктар Лісковіч і сам зрабіў значны ўнёсак у развіццё гэтай медыцынскай установы, якую ўзначальваў восем гадоў. З яго ўдзелам будынак абнавіўся, набыта новае абсталяванне, значна выросла зарплата работнікаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ЖЫЦЦЁВЫ СТРЫЖАНЬ

Апынуцца па той бок крымінальнай навіны

20 мільёнаў вынікаў выдае пошукавік у інтэрнэце на запыт «жудасная аварыя ў цэнтры Гомеля 12 кастрычніка 2019 года». На відэа і фотарэпартажы з месца ДТЗ, што адбылося на вуліцы Савецкай, нельга глядзець са спакойным сэрцам. «Звязда» таксама пісала аб падрабязнасцях трагічнага здарэння **http://www.zviazda.by/be/news/20191015/1571130303-sk-raspavyou-padrabyaunasci-tragedyi-u-gomeli.**

Па той бок крымінальнай навіны, якая абляцела краіну, а потым доўга мусіравалася ў сацсетках, аказалася гамяльчанка Таццяна Бойнічава. Той вечар якраз у прафесійнае свята — Дзень настаўніка — падзяліў жыццё педагога на безапеляцыйныя «да» і «пасля». Адно імгненне адабрала ў яе сяброўку, кар'еру, здароўе... Потым была доўгая барацьба за жыццё, а ўрэшце, як прысуд, — інвалідная каляска.

У гадавіну жудаснай аварыі, якая забрала жыццё найлепшай сяброўкі Алы, а саму яе скалечыла, Таццяна Львоўна не можа прымусіць сябе ўбачыць месца здарэння. Да таго ж яна, некалі актыўны чалавек, педагог амаль з 30-гадовым стажам, любіміца калектыву, дзяцей і іх бацькоў, сёння вельмі рэдка можа выйсці з кватэры на вуліцу. Пад'езд шматпавярховіка, у якім яна жыве, на жаль, дрэнна прыстасаваны для інвалідаў-калясачнікаў.

Баліць і цела, і душа

— Я апрытомнела праз два дні пасля аварыі. Памятаю толькі вочы мужа ды сына, — расказвае Таццяна Бойнічава і просіць не саромецца задаваць «балючыя пытанні». Яна прывыкла. Горш, калі сэрца пячэ ад няшчырасці:

— Калі мяне толькі прывезлі з ДТЗ, на назе была парвана аорта. Увогуле ледзь паспелі давезці да бальніцы, таму што я губляла шмат крыві. Спачатку ўрачы змагаліся за тое, каб я проста засталася жыць. Праз тыдзень, калі стан нармалізаваўся, — зрабілі паўторную аперацыю. Увесь гэты час я думала аб сваёй сяброўцы, была ўпэўнена: яна ў цяжкім стане, можа, у іншай бальніцы, але мы хутка сустрэнемся. 29 кастрычніка — дзень нараджэння Алы. Мяне ўжо перавялі ў звычайную палату, і я ўначы вырашыла напісаць ёй, павіншаваць першай. Адкрыла старонку ў сацсетцы і ўбачыла фота ў чорнай рамцы. Свет абрынуўся. Душа скалечаная не менш за маё цела.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У лютым Таццяну Львоўну накіравалі ў Рэспубліканскую бальніцу медыцынскай рэабілітацыі ў Аксакаўшчыне.

— Я жыла гэтым момантам, — прызнаецца жанчына, — таму што мне казалі, што людзі пасля Аксакаўшчыны ўстаюць і выходзяць на сваіх нагах. Са мной так не здарылася. Але жыць штохвілінным чаканнем, што вось ты хутка пойдзеш, пачнеш адчуваць свае ногі — гэта самая страшная пастка.

Таццяна Львоўна кажа, што ўрачы прагнозаў не робяць: сітуацыя цяжкая — закануты спінны мозг. Але разрываў няма, а значыць — ёсць надзея на выздараўленне. Сёння яе сіла, яе жыццёвы стрыжань, яе вера — гэта муж, сын і мама.

Не прынята абмяркоўваць

— Я працавала доўгі час настаўнікам матэматыкі, потым — намеснікам дырэктара. Марыла зноў вярнуцца да выкладання, каб зноў узяць пяты клас, а потым выпусціць дзяцей у жыццё. Толькі два месяцы вучэбнага года адпрацавала...

Цяпер Таццяна Львоўна — сама вучаніца. Яна вучыцца жыць з інваліднасцю:

— Я стала куды хутчэй перасоўвацца, бо бачу, што маме цяжка. Зараз я ў сваёй сям'і — шэф-кухар. Пачынала з таго, што ў пакоі ставіла на падлогу мультыварку і прасіла прынесці прадукты, загружала ў яе. Цяпер і пірагі пяку сама. Я зразумела, што да аварыі мая сям'я была для мяне крыху на другім плане з-за працы. Усё справы, справы, а ў найбольш складаны момант менавіта муж, сын і мама сталі самай сапраўднай апорай.

Муж Таццяны Бойнічавай — Аляксандр — пераабсталяваў усё ў кватэры, каб жонцы было зручней рухацца на калясцы. Усталявалі неабходныя для рэабілітацыі трэнажоры. Дзень жанчыны цяпер распісаны як у прафесійнага спартсмена. Вельмі важны трэнажор-вертыкалізатар, які выцягвае пазваночнік і дае магчымасць стаяць пэўны час, сям'я набыла дзякуючы сродкам, сабраным прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі Гомеля. Цяпер яшчэ б атрымаць магчымасць выходзіць на вуліцу. Жыць без прагулак і свежага паветра згубна для нерухомага чалавека.

— Мне даводзіцца з'яўляцца на вуліцы, толькі калі муж і сын вяртаюцца з працы. Пакуль яны павячэраюць, адпачнуць, усё — ноч. Праўда, я прывыкла выбірацца з кватэры толькі ў цемры. Баялася, што пазнаюць і будуць шкадаваць. Не хочацца ставіць знаёмага чалавека ў няёмкую сітуацыю, калі ён не ведае, як сябе паводзіць. Таму імкнёмся выбірацца з дому два разы на тыдзень. Бывае, што ўзмацняюцца болі. Калі казаць шчыра, я саромеюся паказвацца ў такім становішчы.

Тым часам Таццяна Львоўна збіраецца на прагулку. Па абсталяванаму пры падтрымцы дэпутата пандусе спускацца значна прасцей, але ўсе разумеюць — гэта прыстасаванне толькі часовае, гаворыць муж гераіні:

— Да гэтага новага спуску ўвогуле ЖКГ былі зроблены драўляныя палазы без абмежавальнікаў. Зразумела, што ў камунальнікаў не было сродкаў на больш грунтоўнае прыстасаванне. Аднойчы каляска з Таццянай пакацілася, і мы з сынам яе ледзьве злавілі, — кажа Аляксандр Бойнічаў, а тым часам лавіруе з каляскай міма чыгуннай батарэі ў пад'ездзе. — Самастойна чалавек на калясцы не спусціцца, гэта відавочна.

Таццяну Львоўну засмучае і тое, што па яе зваротах зроблена нямала, людзі імкнуцца дапамагчы, але ў выніку яна ўсё адно не можа самастойна выехаць на вуліцу. Нават калі прыварыць парэнчы, каляска можа ў любы момант саскочыць з пандуса, бо нахіл спуску празмерна круты.

— У маёй галаве часам шчоўкае — можа, я хутка ўстану і пайду, можа, усё гэта марна, — шчыра перадае свае эмоцыі Таццяна Львоўна. — Але насамрэч жыццё мінае, а такія думкі — пастка.

Яна прызнаецца, што цяпер думае аб тым, як вучыць школьнікаў належна ставіцца да людзей з інваліднасцю:

— Так, цяпер я разумею, што бар'еры — гэта не толькі бардзюры на шляху чалавека ў інваліднай калясцы, яны яшчэ і ў сэрцах. У мой першы «выхад у свет» сустрэла былых калег. Людзі разгубіліся. Пытаюся: што не так? Адказваюць, што не ведаюць, нават як са мной размаўляць. А я ўсё тая ж Таццяна, толькі значная мацнейшая.

Між тым, яна агучвае і іншыя моманты:

— Самы першы званочак, што людзі мяне не забыліся, быў яшчэ ў бальніцы. У мяне быў дзень нараджэння, і я прачнулася не ў палаце, а быццам у кветкавай краме. Вось у мяне траўмы, перажыванні, а жыццё павінна працягвацца. Быццам перанеслася ў адмысловую фотазону: усе з аддзялення прыходзілі да мяне фатаграфавацца. Прыгажосць нават у горы аб'ядноўвае.

Калі вонкавым пандусам можна карыстацца, то ўнутраны пандус трэба мяняць, упэўнены муж Аляксандр.

— Ці ўстанавіць спецыяльны пад'ёмнік.

Але ні тое, ні другое Бойнічавы самастойна зрабіць не могуць. Да рашэння гэтай праблемы далучыўся дэпутат Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу па Гомельскай прамысловай акрузе № 35 Аляксандр Машкараў.

— У дадзеным выпадку пры падтрымцы нашых дэпутатаў і гендырэктара прадпрыемства «Медпласт» было знойдзена тэхнічнае рашэнне. Для новай пляцоўкі выкарысталі матэрыялы трывалыя, але не важкія. Канструкцыя дазваляе чалавеку выязджаць з пад'езда і вяртацца, але, безумоўна, неабходна суправаджэнне. У далейшым, калі канструкцыю трэба будзе ўдасканальваць, мы будзем шукаць іншыя варыянты.

Між тым Таццяна Бойнічава марыць вярнуцца да сваёй работы. Кажа, больш за ўсё жадае зноў бачыць цікаўныя дзіцячыя вочы. Яна не губляе надзею, што знойдзецца магчымасць зрабіць яе жыццё больш мабільным, а значыць — шчаслівым.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

«ТЭРАПІЯ АДЧАЮ» ЦІ БУДУЧЫНЯ МЕДЫЦЫНЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У арганізме кожнага чалавека ёсць невялікі запас ствалавых клетак, але з узростам ён робіцца ўсё меншы і меншы. У нованароджанага суадносіны ствалавых клетак і астатніх складаюць 1:300, а ў мяне ўжо дзесьці 1:300 000, — расказвае **загадчык аддзела клетачных біятэхналогій РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па клетачных тэхналогіях, доктар медыцынскіх навук, прафесар Міхаіл ПАТАПНЁЎ.** — І калі мы захварэлі, а потым паправіліся, гэта працуюць нашы ўнутраныя ствалавыя клеткі. Прымяняючы атрыманыя ў лабараторыі клеткі, мы дапамагаем арганізму аднавіцца. Але клетачная тэрапія эфектыўная там, дзе не дапамагае працяглы прыём прэпаратаў. Таму яе называем тэрапіяй рэзерву, або «тэрапіяй адчаю». Тут урачам даводзіцца ўзважваць, каму прымяняць такое лячэнне, а каму не.

Розныя захворванні патрабуюць рознай дозы ствалавых клетак, а таму і колькасць ін'екцый усюды розная, як і метады іх увядзення. Курсы лячэння пажадана праз нейкі час паўтараць.

Клетачная тэрапія дапаўняе стандартныя метады лячэння, калі браць тую ж анкалогію. І ў параўнанні з хіміятэрапіяй пераносіцца нядрэнна. У пацыента бяруць кроў, вырошчваюць ствалавыя клеткі ў лабараторных умовах і ўводзяць іх хвораму.

Адным з лідараў у прымяненні ствалавых клетак стаў Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі. Тут займаюцца распрацоўкай, выпрабаваннямі, вытворчасцю і захоўваннем ствалавых клетак. Яны выкарыстоўваюцца як для медустаноў, так і для ўласнага прымянення. У інстытуце функцыянуе аддзяленне клетачнай тэрапіі, дзе вядзецца амбулаторны прыём. З пачатку мінулага года тут пралечана 200 пацыентаў, з іх 110 — на платнай аснове.

— Каля 65 % пацыентаў — з анказахворваннямі. Прычым большая іх частка — з ракам падстраўнікавай залозы, — расказвае **дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай біяінжынерыі НАН Беларусі, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Андрэй ГАНЧАРОЎ.** — Большасці з іх такое лячэнне дапамагае прадоўжыць жыццё на некалькі месяцаў. Гэта нядрэннае дасягненне. Рак падстраўнікавай залозы — цяжкае анкалагічнае захворванне, дзе першапачаткова прагноз вельмі дрэнны. У нас ёсць пацыенты з выяўленай 4-й стадыяй, якія жывуць некалькі гадоў.

Выкарыстоўваюцца ствалавыя клеткі і для лячэння захворванняў, у аснове якіх ляжыць залішні імунны адказ. Яны прыгнятаюць яго, а разам з ім і запаленне.

— На базе НПЦ хірургіі і транспланталогіі праходзіць клінічнае выпрабаванне выкарыстання нашых ствалавых клетак для лячэння сістэмнай чырвонай ваўчанкі — цяжкай хваробы, якая за некалькі гадоў прыводзіць да інваліднасці. Гэта клеткі ад некалькіх донараў, і яны валодаюць высокай супрацьзапаленчай імунамадэлюючай актыўнасцю. Вынікі пакуль вельмі нядрэнныя. Мы заўважылі запаволенне прагрэсіравання хваробы, — адзначае Андрэй Ганчароў.

Па словах кіраўніка інстытута, актыўна выкарыстоўваюцца ствалавыя клеткі і ў стаматалогіі. Прычым прымяняюцца як недыферэнцыраваныя, так і дыферэнцыраваныя клеткі, якія становяцца асновай не толькі мяккіх тканак, але і касцей. У прыватнасці, у межах навуковага праекта такое лячэнне прымянялася пры рэцэсіі (змяншэнні аб'ёму) дзясны. З дапамогай ствалавых клетак удаецца дасягнуць павелічэння аб'ёму дзясны, і гэтага эфекту хапае на 1—2 гады. Другі навуковы праект скіраваны на аднаўленне касцявой тканкі.

Акрамя гэтага, інстытут біяфізікі праводзіць клінічныя выпрабаванні па лячэнні ствалавымі клеткамі хвароб вачэй, апёкаў, бясплоднасці, нетрымання мачы ў мужчын пасля прастатэктаміі. Працуюць тут над бія- і 3D-друкам, у прыватнасці друкам штучнай скуры. Усяго інстытут сумесна з зацікаўленымі праводзіць 26 клінічных выпрабаванняў. Ужо зарэгістраваны чатыры біямедыцынскія клетачныя прадукты, тры выкарыстоўваюцца без рэгістрацыі (для ўласных патрэб).

— Мы шмат працуем у кірунку імуналогіі. З пачатку мінулага года ў нас створана новая лабараторыя імуналогіі. З наступнага года будзе яшчэ адна пад рабочай назвай малекулярнай імуналогіі. Іх асноўная задача — лячэнне аўтаімунных захворванняў,— падзяліўся планамі Андрэй Ганчароў.

Пры інсультах і трамбозах

Яшчэ адна навуковая ўстанова, якая актыўна выкарыстоўвае ствалавыя клеткі, — Інстытут фізіялогіі НАН Беларусі. Пры ім створаны Цэнтр мозга, які займаецца вывучэннем розных спосабаў яго аднаўлення пры траўмах, пашкоджаннях, інсультах.

— Традыцыйныя метады лячэння, якія прымяняюцца пры інсультах і трамбозах, не заўсёды эфектыўныя. А колькасць пацыентаў з такімі праблемамі расце, прычым яны «маладзеюць», — кажа **вучоны сакратар Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Маргарыта ДОСІНА.**

З дапамогай ствалавых клетак удаецца дасягнуць павелічэння аб'ёму дзясны, і гэтага эфекту хапае на 1—2 гады. Другі навуковы праект скіраваны на аднаўленне касцявой тканкі.

Яна адзначае, што традыцыйна ствалавыя клеткі ўводзяць у сістэмны крываток — артэрыяльна ці венозна. Але гэты метад мае істотны недахоп: клеткі разгрупоўваюцца па ўсім арганізме, дасягаючы галаўнога мозга ў малой колькасці — усяго 1—3 %. Яшчэ адзін спосаб увядзення — у зону пашкоджання — таксама мае істотны недахоп. Ён патрабуе дадатковага хірургічнага ўмяшання — трэпанацыі чэрапа, што не заўсёды падыходзіць пацыенту.

У інстытуце фізіялогіі распрацавалі новы спосаб увядзення ствалавых клетак. Калі траўма ў пярэдняй частцы мозга, то яны ўводзяцца праз слізістую носа, адкуль застаецца пераадолець нязначную адлегласць да месца пашкоджання. Калі траўма ў задняй частцы, то клеткі ўводзяць у трайчасты нерв.

«І калі мы захварэлі, а потым паправіліся, гэта працуюць нашы ўнутраныя ствалавыя клеткі. Прымяняючы атрыманыя ў лабараторыі клеткі, мы дапамагаем арганізму аднавіцца».

— Гэты спосаб паказаў сваю эфектыўнасць. Праз 24 гадзіны яны дасягаюць мэты і лакалізуюцца ў зоне траўмы. Гэта найменш траўматычны спосаб для пацыента, — дзеліцца Маргарыта Досіна. — З 2016 года мы вядзём сумесныя даследаванні з РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі. Больш чым 50 пацыентам былі паспяхова ўведзены ствалавыя клеткі.

З гэтага года інстытут фізіялогіі сумесна з РНПЦ траўматалогіі і артапедыі пачаў вывучэнне прымянення ствалавых клетак пры пашкоджанні спіннога мозгу. Калі метад пакажа сваю эфектыўнасць, з наступнага года яго апрабуюць у клініцы.

Выкарыстоўваліся метады клетачнай тэрапіі і пры лячэнні COVID-19. Як адзначыў Міхаіл Патапнёў, смяротных выпадкаў ад каранавіруса пасля прымянення такога метаду не было, але ён не з'яўляецца панацэяй.

А вось прымяненне біямедыцынскага клетачнага прадукту для амаладжэння арганізма вучоныя і медыкі называюць сумнеўнай задумай з істотнымі фінансавымі затратамі. У Швейцарыі курс амаладжэння каштуе 15-16 тысяч еўра. Пры гэтым эфект невідавочны і яго хапае на 1-2 гады. Да таго ж пакуль да канца не вывучаны наступствы гэтага метаду, менавіта з ім некаторыя звязваюць вялікія праблемы са здароўем, у прыватнасці анказахворванні ў некаторых расійскіх зорак.

— Выкарыстанне ствалавых клетак для амаладжэння — гэта, па сутнасці, псеўданавука. Мы ёй не займаемся, — падкрэсліў Андрэй Ганчароў.

Алена КРАВЕЦ.

А не шкодзь!

ГУЧНЫЯ ЗАТРЫМАННІ БРАКАНЬЕРАЎ

Чым скончыліся нелегальныя паходы на казуль і ласёў, паведамляе Дзяржаўная інспекцыя па ахове жывёльнага і раслiннага свету.

Позна ноччу ў вёсцы Варганы Докшыцкага раёна інспектары Глыбоцкай міжрайінспекцыі і супрацоўнікі міліцыі спынілі аўтамабіль «Ніва», на якім мясцовы жыхар перавозіў больш за 200 кілаграмаў мяса незаконна здабытага ім лася, а таксама трафейныя рогі з сямю адгалінаваннямі. Мужчына быў паляўнічым, у яго канфіскавалі зарэгістраваную стрэльбу.

gosinspekciya.gov.by

У той жа дзень у Магілёўскім раёне разгарнулася пагоня за паляўнічымі-нелегаламі. Істотную дапамогу ў іх затрыманнi аказаў законапаслухмяны прадстаўнік паляўнічай супольнасці. Рэйдавая група інспектараў працавала ва ўгоддзях каля вёскі Вендараж, дзе сустрэла егера і паляўнічага. Праз некаторы час егер па тэлефоне паведаміў, што чуў падазроныя стрэлы ў лесе, а яго кампаньён прапанаваў інспектарам сваю дапамогу.

Праваахоўнікі занялі пазіцыю каля дзвюх дарог, па якіх маглі б выязджаць меркаваныя браканьеры. Неўзабаве з лесу на вялікай хуткасці выскачыў аўтамабіль «Рэно», за ім рушыў услед на сваім аўто паляўнічы, да якога падсеў інспектар. Спярша парушальнікі нават не здагадваліся пра пераслед, але калі на пад'ездзе быў другі экіпаж, ім перагарадзілі дарогу.

gosinspekciya.gov.by

У «Рэно» двое мужчын перавозілі часткова разабраныя тушы ласіхі і ласяняці-сяголетка. Як высветлілася, жывёл здабыў кіроўца аўто. Ён паляўнічы, аднак у той дзень выходзіў ва ўгоддзі з пуцёўкай на птушак, значыць, не меў права страляць па капытных. Усведамляючы наступствы свайго ўчынку, мужчына схаваў стрэльбу на дачы ў знаёмага, які і дапамог яму з разборам ласёў. Абодвум парушальнікам пагражае крымінальнае пакаранне, а жаданне пакаштаваць дзічыны абыдзецца ў 16,2 тысячы рублёў.

У Валожынскім раёне інспектары Маладзечанскай міжрайінспекцыі адпрацоўвалі атрыманую імі інфармацыю: мясцовыя жыхары не раз бачылі ва ўгоддзях каля вёскі Ясьманаўцы белы мікрааўтобус, на якім, на іх думку, маглі перасоўвацца браканьеры. У той дзень ён зноў з'явіўся — позна ўвечары яго заўважыў і спыніў экіпаж ДАІ. Як толькі патрульныя зазірнулі ўнутр і ўбачылі падбітых казуль, двое пасажыраў кінуліся наўцёкі.

Затрыманы кіроўца ўзяў віну за незаконнае паляванне на сябе. Нягледзячы на гэта, зараз устанаўліваюцца асобы ўцекачоў, якія праявілі на паляванні асаблівую жорсткасць. Адна з дзвюх здабытых імі казуль была яшчэ жывая і моцна мучылася — жывёле прастрэлілі хрыбетнік. На жаль, выратаваць казулю не ўдалося.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Выстаўка

ГРОДНА НАТХНЯЕ

Горад вачыма фотамастакоў з Беларусі, Расіі, Польшчы і Славакіі

Горад над Нёманам адлюстравалі ў сваіх работах аматары і прафесіяналы — члены народнага фотаклуба «Гродна». Гэта свайго роду прызнанне аўтараў у любові да старажытнага горада.

— Тут і будынкі, і прыгожыя дзяўчаты, і хвіліны свят, канцэртаў... Усё, што парадавала вока фотамайстроў, а іх у выстаўцы ўдзельнічае паўсотні, прадстаўлена каля 200 работ. Упершыню ўдзельнічае некалькі замежнікаў. Яны бывалі ў нашым горадзе. Гэта майстры з Польшчы, Расіі, Славакіі, — расказвае нязменны **старшыня фотаклуба Аляксандр ЛАСМІНСКІ.**

У кожнага аўтара свая тэма. Але многія адгукнуліся на актуальныя праблемы. Напрыклад, Андрэй Ветраў выбраў тэму каранціна: па пустой вуліцы горада ідзе выпускнік-2020 з лентай і ў масцы. У экспазіцыі шырока прадстаўлены гістарычныя аб'екты, у прыватнасці, Стары замак, дзе цяпер вядзецца рэканструкцыя. На здымках можна ўбачыць усе этапы работы. Вядома, гэта знакавы аб'ект горада, адсюль пачалася гісторыя Гродна, таму ён заўсёды цікавы. Звяртаюць на сябе ўвагу вобразы прыгожых гарадзенак. Замежнікі кажуць, што ў Гродне самыя прыгожыя жанчыны, і калі глядзіш на фотаздымкі, з гэтым нельга не пагадзіцца. Шмат святочных фота. Сапраўды, Гродна — горад фестываляў, канцэртаў, увогуле мастацтва. Цікава, што ў многіх аўтараў прафесія звязана менавіта з мастацтвам. Напрыклад, Аляксандр Луцэнка — былы акцёр Гродзенскага драмтэатра, які працаваў тут больш за 30 гадоў. На выстаўцы можна ўбачыць яго фота з тэатральнага жыцця. Але ён таксама вельмі любіць рабіць здымкі людзей, асабліва сталых і малых.

А вось прафесійны музыкант Аляксандр Пасечнік шукае ў горадзе новыя формы. Дакладней, лініі. Як аказалася, ён вельмі любіць геаметрыю і нават прадставіў на гэту тэму асабістую выстаўку. Вось і зараз яго здымкі перакліканюцца з мастацтвам кубізму:

— У горадзе з'явіліся новыя лініі — вялізны гандлёва-забаўляльны цэнтр «Трыніці». Таму ў мяне ўзнікла ідэя зрабіць такія здымкі з лініямі. Я пайшоў а дзявятай гадзіне вечара, і да сямі раніцы хадзіў вакол будынка, каб зняць яго ў розных ракурсах. Зрабіў здымкі закаханай пары, якія таксама сустракалі світанак, і назваў гэтую кампазіцыю — «Ад рамантыкі да авангарда».

Не магу не расказаць пра члена клуба Людмілу Сцяцкевіч, чые работы з гарадскога жыцця таксама ўдзельнічаюць у выстаўцы. Жанчына вядзе барацьбу з цяжкай хваробай. Па ўсім відаць, што нават нязначны рух патрабуе ад яе істотных намаганняў. Каля сваіх работ Людміла расказвае, што кадр «падглядзела» падчас паездкі ў гарадскім транспарце. Яна шукае сюжэты паўсюдна. Нават кот у акне можа стаць героем яе фотаздымка.

— Калі са мной такое здарылася, я была рада, што магу здымаць. Я люблю гуляць па горадзе, здымаю закаты, нейкія гарадскія сцэнкі, раблю сэлфі, — расказвае Людміла. — Цяпер больш часу менавіта для творчасці. У мяне перыяд шчасця. Чымсьці прыйшлося ахвяраваць, але адкрыліся іншыя магчымасці, і гэта таксама трэба цаніць.

Вось такія яны, творчыя асобы, якія імкнуцца спыніць прыгожыя імгненні гарадскога асяроддзя. Дарэчы, на выстаўцы ёсць і работы фотакарэспандэнта «Звязды» Яна Хведчына, маладога фатографа, гродзенца, удзельніка фотаклуба «Гродна».

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ТАЙНЫ КАНЦЫЛЯРЫІ МІНУЛЫХ ЧАСОЎ

У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстаўка «Тайны канцылярыі», якую музейшчыкі стварылі сумесна з даследчыкам, лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімірам ЛІХАДЗЕДАВЫМ.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

На думку самога калекцыянера, гэта экспазіцыя раскрывае гісторыю беларускага пісьменства з нязвыклага ракурсу:

— Нам хацелася паказаць, пры дапамозе чаго і на чым пісалі нашы продкі. Выстаўка ахоплівае перыяды развіцця пісьменнасці з даўніны і па 1945 год.

— Мы сёння знаходзімся на адкрыцці выстаўкі, здавалася б, звычайнай. Усе мы з вамі карыстаемся прыладамі для пісьма, але далёка не заўсёды задумваемся, як тэхналогія пісьма з'явілася і як яна паўплывала на развіццё цывілізацыі, — заўважыў **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША.** — Тэму экспазіцыі мы задумалі разам з Уладзімірам Ліхадзедавым некалькі гадоў таму, калі адбывалася святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, і ладзіліся рознага кшталту выстаўкі, дзе дэманстраваліся рукапісы, старадрукі і многае іншае. Я бачыў, як загараліся вочы ў людзей, калі яны разглядалі старыя пісьмовыя прылады. Гэты выставачны праект — першая ў гісторыі краіны спроба маштабна паказаць гісторыю развіцця пісьменства праз такія артэфакты. Шмат адкрыццяў тут зможа зрабіць кожны. І гэта толькі пачатак. Шмат таямніц канцылярыі мы яшчэ плануем адкрыць як у сценах бібліятэкі, так і ў віртуальнай прасторы.

На выстаўцы наведвальнікі ўбачаць, чым пісалі нашы продкі ў XV—XX стст., першыя алоўкі і асадкі, пер'яныя чысткі, пясочніцы, чарніліцы і іншае. А яшчэ можна будзе даведацца, які тавар айчынных і замежных вытворцаў быў хадавы ў канцылярскіх і папяровых крамах Мінска і Гродна ў старыя часы, як і што рэкламавалі на канцылярскіх прадметах пачатку XX ст., якія адмысловыя пісьмовыя прылады клалі ў сакваяж падарожнікі.

У сваю чаргу **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— Уражвае ўсё сабранае тут. Але не толькі колькасна, але і, безумоўна, сутнасна. Напрыклад, асобны раздзел прадстаўляе паперу беларускай вытворчасці, якая прадавалася ў гандлёвых крамах паўсюль. Уладзімір Аляксеевіч разам з гэтай калекцыяй сабраў і процьму фактаў з гісторыі пра тыя ці іншыя экспанаты. Вельмі хацелася б, каб гэта знайшло адлюстраванне ў яго новых кнігах.

Дарэчы, асобную частку выставы займае школьная тэма, дзе выяўляецца змесціва ранца гімназістаў розных эпох (сшыткі, алоўкі, асадкі, тачылкі, закладкі, пеналы), і нават дэманструецца, як выглядала парта ліцэіста Аляксандра Пушкіна... Яшчэ экспазіцыя прадстаўляе пісьмовыя прылады вядомых асоб — князёў Радзівілаў, родных кампазітара Станіслава Манюшкі, краязнаўцы і гісторыка Отана Гедэмана, фінансіста Палякова, нямецкага фатографа Фрыца Краўскопфа, маршала Ціма-шэнкі і іншых. Для сапраўдных «гурманаў канцылярыі» прадстаўлены пісьмовыя наборы, чарніліцы ў розных мастацкіх стылях, а таксама ўзоры пісьмовых прылад высокамастацкай работы з каштоўных матэрыялаў.

Варта адзначыць, што экспазіцыя падрыхтавана ў межах праекта Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага» і дазваляе праз прадметы аўтарскай калекцыі адкрыць забыты пласт матэрыяльнай культуры.

Выстаўка «Тайны канцылярыі» будзе працаваць да 15 лістапада 2020 г. штодзень, акрамя панядзелка і дзяржаўных свят. Уваход — вольны.

Алена ДРАПКО.

Рэальная падтрымка

У Мінскай вобласці звыш 22,8 тысячы шматдзетных сем'яў атрымалі матэрыяльную дапамогу для падрыхтоўкі дзяцей да школы, паведаміла прэс-служба Мінаблвыканкама

Адзін з відаў падтрымкі — згодна з дзяржпраграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады (падпраграма «Сям'я і дзяцінства») — датычыцца сем'яў, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей. Так, ім выплачана аднаразовая матэрыяльная дапамога для падрыхтоўкі дзяцей да школы ў памеры да 30 % бюджэту пражыткавага мінімуму. На 14 верасня яе атрымалі 17,3 тысячы сем'яў. Сума фінансавай падтрымкі склала звыш Br2 млн.

Матдапамога малазабяспечаным і шматдзетным сем'ям выплачвалася і з іншых крыніц: па месцы працы бацькоў, праз аказанне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай і гуманітарнай дапамогі, падчас правядзення дабрачынных акцый, за кошт спонсарскіх сродкаў. З 1 ліпеня да цяперашняга часу адрасную дапамогу атрымалі 515 малазабяспечаных сем'яў, якія выхоўваюць 808 школьнікаў. Дапамога для падрыхтоўкі дзяцей да школы па месцы працы бацькоў аказана больш як 7,7 тысячы малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, або 13 тысячам школьнікаў.

Усяго розныя віды дапамогі атрымала больш за 22,8 тысячы шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваюцца 45,9 тысячы школьнікаў, і больш за 5 тысяч малазабяспечаных сем'яў — 6608 школьнікаў. Сумы выплат склалі Br2,8 млн і Br638 тыс. адпаведна.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Фестывалім!

«КЛЁВАЕ МЕСЦА»

Так называецца свята, якое правялі днямі ў аграгарадку Барсукі Докшыцкага раёна, што на Віцебшчыне

Як растлумачыла карэспандэнту «Звязды» кіраўнік Барсукоўскага сельскага Дома культуры Алена СКУМС, гэта мерапрыемства — адзін з брэндаў раёна. У кожнай аналагічнай установы ёсць «аўтарскі праект». А ў гэтым населеным пункце, які прыкладна за пяць кіламетраў ад райцэнтра, вырашылі назваць яго «Клёвае месца», бо мясцовае возера славіцца добрымі ўловамі.

Але такое свята — не спаборніцтва для рыбакоў з канцэртнай часткай «на закуску», а, можна сказаць, цэлы міні-фестываль. Яго правялі ўпершыню больш за пяць гадоў таму. І адразу феерычны фэст палюбіўся месцічам і гасцям, якія спецыяльна прыязджаюць па прыемныя эмоцыі ў глыбінку.

На мерапрыемстве было шмат цікавага. І яно традыцыйна спадабалася людзям розных узростаў. У прыватнасці, арганізавалі конкурсы дзіцячых калысак, аформленых у «водным стылі», рыбных страў, вызначэння, з якой рыбы зроблена юшка... Пераможцы атрымалі прызы.

Запомніцца надоўга і шыкоўная канцэртная праграма з удзелам самадзейных калектываў, а таксама пантаміма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота дадзена арганізатарамі мерапрыемства.

«ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ НАМ АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ?»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У найбліжэйшы час яшчэ пяць губернатараў прыедуць для сустрэчы з кіраўніком дзяржавы, акрамя свайго ўдзелу ў форуме. Цікавасць з боку расійскіх рэгіёнаў сапраўды вялікая. Гэта дае падставы для далейшага развіцця: мы павінны выйсці на стабільнае жыццё нашых людзей, стабільную работу прадпрыемстваў, уцягненне моладзі ў гэтыя працэсы. Патрыятызм, эканоміка і стабільнасць — паняцці тоесныя, калі іх раскласці па складніках. Таму ў нас будзе дзейнічаць пяць секцый па ўсіх кірунках. Я буду ўзначальваць работу секцыі, у якой разгледзім ролю моладзі ў развіцці аграпрамысловага комплексу.

Стварылі 1418 аграгарадкоў — захавалі галіну

«МС»: ***Тэматычная секцыя, якую вы ўзначаліце, будзе адной з ключавых. Раскажыце, калі ласка, якія гаспадаркі ў якасці прыкладу паспяховай работы вы прадэманструеце калегам?***

— Лічу, што ўсе секцыі ключавыя, але я з вамі згодны, цікавасць да яе вялікая… На прыкладзе агракамбіната «Дзяржынскі» падзелімся паспяховым вопытам устойлівага рэгіянальнага развіцця. Дарэчы, я разглядаў бы яго ў сувязі з цяперашняй сітуацыяй і дэструктыўнымі сіламі, якія дэманструюць натуральную слепату, быццам бы не было 26 гадоў… Маўляў, трэба браць 1994 год і цяперашні. Краіна быццам бы з'явілася з ніадкуль… Яна падымалася з нуля: па праграмах, кірунках, рабоце з рэгіёнамі… Кіраўнік дзяржавы на пачатку сваёй дзейнасці казаў: толькі праз рэгіёны мы будзем выходзіць на выкананне пастаўленых задач, таму што там прымаюцца рашэнні (так, палітычныя рашэнні прымаюцца на высокім узроўні, а практычныя — там). Адна з праграм развіцця аграпрамысловага комплексу праз стварэнне шматпрофільных прадпрыемстваў з гуманітарным і сацыяльным кампанентамі — гэта цяперашнія аграгарадкі, якіх у нас 1418. Іх з'яўленне дазволіла стабілізаваць аграпрамысловы комплекс, накарміць, напаіць, апрануць людзей і зарабіць валюту. Вось уявіце — сёння няма шасці мільярдаў долараў ад продажу на экспарт прадукцыі сельскай гаспадаркі. Іх няма. Нават калі ўзяць крэдыт на шэсць мільярдаў, нават самы льготны 4 % — трэба прыкладна 220 мільёнаў долараў для выплаты толькі працэнтаў. Колькі дзіцячых садкоў можна пабудаваць за гэтыя грошы?

На выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Клічаўскім раёне.

Фота Яўгена ПРОСЕЦКАГА.

«МС»: ***Шэсць мільярдаў — гэта большая частка залатавалютнага рэзерву краіны…***

— Можна і так сказаць. На сховішчы любога сыразавода, дзе галоўкі сыра, — гэта ляжаць еўра ці залатыя зліткі, як хочаце, так і называйце. Тое самае і ў агракамбінаце «Дзяржынскі». Тут мы можам паказаць, як арганізавана яго работа.

> Што перашкаджае аб'яднаць намаганні? Мы канкурыруем адно з адным, страчваем грошы, а выйграе хтосьці трэці.

Аграгарадок пачынаецца з садка, школы, бальніцы, ФАПа, Дома культуры, музычнай школы, спартыўнай залы… Усё для моладзі! Далей — годны заробак і нармальныя рабочыя месцы. Таму што, з аднаго боку, калі ёсць добрая зарплата і няма куды падзець дзяцей — ніхто не паедзе ў вёску. З другога — калі паклапаціўся аб «сацыялцы», але няма рабочых месцаў і вытворчасці, таксама яе страчваем. Чаму менавіта агракамбінаты трэба разглядаць у якасці паспяховай мадэлі прыцягнення моладзі? Калі яны зарабляюць, тады ідуць далей — напаўняць «сацыяльны пакет» і нават развіваюць экалагічны кірунак. На прыкладзе агракамбіната «Дзяржынскі» відаць — экалагізацыя паўсюль. Акрамя гэтага, культурная, патрыятычная, гістарычная спадчына. Усе помнікі, пахаванні даглядаюцца мясцовая ўлада, і львіная доля кладзецца на прадпрыемствы, якія іх даглядаюць. Мы пакажам побыт партызанскага атрада, які ўзнавілі на колішнім месцы. Адна справа — расказваць дзецям, як гэта было, зусім іншая — пайсці, паглядзець, дакрануцца да гісторыі і згадаць, дзе былі дзядуля, прадзядуля, бабуля і што яны зрабілі для Перамогі.

Акрамя таго, прадэманструем і суперсучасныя тэхналогіі на базе абсалютна экалагізаванай малочнатаварнай фермы. На прыкладзе дзейнасці дзяржаўных праграм мы пакажам, чаго дасягнулі. Дарэчы, аб эканоміцы: у гэтым аграгарадку вырабляецца 20 % мяса птушкі ўсёй краіны. Ніякіх праблем і з надоямі — дзесяць тысяч літраў малака на карову. Таму тут атрымліваюць сур'ёзны прыбытак. Але гэтыя аграгарадок і агракамбінат важныя яшчэ і тым, што яны не замыкаюцца на сабе. Зараз у вытворцы больш за 40 тысяч гектараў зямлі не толькі ў Дзяржынскім раёне: ён «падцягнуў» палавіну Крупак, будуе фабрыку па вытворчасці мяса індычкі ў Капылі, ёсць прадпрыемства ва Уздзе. Таму свая міжрэгіянальная палітыка ахапіла чатыры раёны ўнутры краіны. Гэтым вопытам мы таксама падзелімся на тэматычнай секцыі.

Плячо ад дзяржавы

«МС»: ***Вы закранулі цікавую тэму: вытворчасць мяса індычкі, да нядаўняга часу гэта была прэрагатыва фермерскіх гаспадарак і інвестара з Літвы. Да яе пачалі далучацца і буйныя айчынныя вытворцы?***

— У краіне патрэба складае 15—20 тысяч тон у год плюс экспартны складнік. Таму, лічу, адно аднаму не перашкаджае і кірунак мы абралі правільны. Першую партыю мяса індычкі агракамбінат «Дзяржынскі» выпусціць ужо ў наступным годзе. Палітыка дзяржавы цікавая ў чым? У нас няма градацыі, маўляў, мы дапамагаем выключна буйным таварным комплексам. Фермер у нас працуе па такіх жа правілах і атрымлівае крэдыты. Акрамя таго што яны плацяць падатак у памеры 1 % з выручкі, як усе, але фермер яшчэ і падхоплівае тую нішу, якую буйныя вытворцы і не будуць займаць. Асабістыя дапаможныя гаспадаркі таксама падтрымліваем: усе лішкі прадукцыі Белспажыўсаюз купляе ў насельніцтва па добрай цане. Гэта яшчэ дадатковая крыніца прыбытку. То-бок палітыка дзяржавы выбудавана такім чынам, што кожная ніша закрываецца. І наадварот, — даём магчымасць кожнаму сябе рэалізаваць: ад ІП і асабістай дапаможнай гаспадаркі да буйнога сельгаспрадпрыемства. Магутных холдынгаў, якія мы пачыналі стварацьна першых этапах, ужо некалькі дзясяткаў. Цяпер яны вырабляюць 35—40 % прадукцыі ў краіне і прыкладна столькі ж экспартуюць.

Колькі ў свой час было нараканняў адносна пабудовы буйных МТФ?! Так, пабудавалі, але фермы эксплуатуюцца 35 гадоў — мы пабудавалі іх на два пакаленні наперад. Давайце ўявім: іх зараз няма. Стаялі б малочныя заводы, мясакамбінаты, не было б гандлю. Далей. Зрабілі сучасныя сховішчы для агародніны — атрымалі на гэтым дадатковы прыбытак. Бульбасховішчы — гэта мільён тон бульбы з перапрацоўкай на самых сучасных магутнасцях.

«МС»: ***Пераходзячы ад эканамічнай дзейнасці да сацыяльнай накіраванасці, якія меры і сучасныя стандарты патрэбныя для эфектыўнага замацавання маладых кадраў на вёсцы, павышэння сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці вясковай моладзі?***

— Чатыры складнікі, я мяркую, для таго, каб замацавацца: першы — дастойны заробак, другі — жыллё, трэці — вольны час, чацвёрты — падрыхтоўка кадраў. То-бок людзі павінны прыходзіць у прафесію з разуменнем. Сістэма мэтавага накіравання, я лічу, вельмі добрая: дзяржаве патрэбны аграном, ёсць бюджэтны набор і выпускнік каледжа, які хоча працаваць. Таму накіроўваем яго адразу на трэці курс аграрнай ВНУ і далей на работу ў рэгіён. Калі ты атрымаў стыпендыю ад дзяржавы, ты павінен яе адпрацаваць. Так усюды ў свеце. Навучылі бясплатна, але на месцы павінны стварыць адпаведныя ўмовы. Вось асноўныя складнікі.

> Магутных холдынгаў, якія мы пачыналі стварацьна першых этапах, ужо некалькі дзясяткаў. Цяпер яны вырабляюць 35—40 % прадукцыі ў краіне і прыкладна столькі ж экспартуюць.

Патрэбна кааперацыя

«МС»: ***Міхаіл Іванавіч, на мінулым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў полі зроку тэматычнай камісіі была рэалізацыя сумесных праграм па селекцыі і племянной справе. Ці ёсць вынікі і якія яны?***

— Гэта была мая ініцыятыва. Я раскажу, як гэта было і што нам трэба выключыць. Калі Уладзімір Уладзіміравіч (Пуцін. — **Аўт.**) і Аляксандр Рыгоравіч (Лукашэнка. — **Аўт.**) наведвалі выстаўку «Белагра», гэта быў перыяд, калі нашы краіны трапілі пад эмбарга Еўропы. Племянныя яйкі, птушанят, суперплемянных свінак мы набываем за мяжой — у Данії, Германіі, Нідэрландах. У нас ёсць свае напрацоўкі, можа, не такія высокаэфектыўныя, але яны забяспечваюць нармальную стабільную работу. У Расіі яшчэ з часоў Савецкага Саюза па птушцы — вельмі добрая школа, у нас — па буйной рагатай жывёле і свіннях. Са згоды кіраўніка дзяржавы я звярнуўся да Уладзіміра Уладзіміравіча з прапановай, каб у межах Саюзнай дзяржавы стварыць племянныя цэнтры ў нас і ў Расіі і забяспечваць сябе і краіны ЕАЭС. Прэзідэнт Расіі пагадзіўся і звярнуў увагу, каб дакументы рыхтавалі на яго імя, каб трымаць на кантролі, інакш, маўляў, завалакіцяць. І вось ідзе валакіта… Усё прынялі і гэтае пытанне на форуме мы будзем узнімаць, Іван Крупко (міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі. — **Аўт.**) выступіць на нашай секцыі, на якой будзе Дзмітрый Патрушаў (расійскі міністр сельскай гаспадаркі. — **Аўт.**), яны дасведчаныя маладыя людзі. Зараз вырашэнне гэтага пытання знаходзіцца ў найвышэйшай ступені гатоўнасці: на калегіях міністэрстваў прайшлі экспертныя заключэнні, засталося толькі вызначыць і рэалізаваць. У нас у агракамбінаце «Дзяржынскі» ёсць фабрыка — працэнтаў на 60 % мы сябе забяспечваем, — яе можна назваць племянным цэнтрам і развіваць тэму далей. А каб рэалізацыя рушыла ад слоў да справы, трэба ставіць канкрэтны тэрмін выканання і несці за гэта адказнасць.

«МС»: ***Напрыканцы размовы хацелася б даведацца аб далейшых планах беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў аграрным сектары, акрамя развіцця племянных цэнтраў.***

— Трэба падымаць пытанне аб адзінай прамысловай палітыцы, яе паміж краінамі няма, а з гэтага вынікае страшэнная шкода. Дарэчы, што датычыцца адзінай аграрнай палітыкі — тут прасунуліся даволі нядрэнна. А прамысловую нам неабходна абавязкова развіваць. Возьмем, напрыклад, трактарабудаванне: Кіраўскі завод робіць трактары, і ў Мінску іх робяць. Неабходна вызначыцца, які аб'ём трактароў патрэбны Беларусі, Расіі і плюс на адзіную мытную прастору. Дакладней: хто і колькі будзе вырабляць? Вялікі трактар у нас добра атрымліваецца — мы яго зробім на ўсіх, маленькі ў вас — рабіце вы. Тое самае з камбайнабудаваннем — мы блытаемся паміж сабой. Што перашкаджае аб'яднаць намаганні? Мы канкурыруем адно з адным, страчваем грошы, а выйграе хтосьці трэці. Таму перспектывы такія: развіваць аграпрамысловую палітыку далей. Менавіта зараз трэба заняцца племянным кірункам, ільном (і забяспечыць ім заводы), перапрацоўкай і сумесна выбудоўваць адзіны ўнутраны рынак, забяспечыць работай спачатку сваіх людзей і толькі потым дапускаць кагосьці іншага. Трэба даць магчымасць зарабіць, развіць, падняць галіну і не залежаць ад кагосьці.

Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.

СТАРТ ДЛЯ РАЗУМНЫХ І ТАЛЕНАВІТЫХ

У эфір тэлеканала АНТ на наступным тыдні вяртаюцца з новымі сезонамі адразу два праекты.

Спартыўна-забаўляльнае шоу «Ледніковы перыяд» зноў збярэ каля экранаў аматараў фігурнага катання. Праект вяртаецца ў эфір пасля чатырохгадовага перапынку. Сёлетні дзясяты сезон стаў для «Ледніковага перыяду» юбілейным. Нагадаем, сутнасць праграмы ў тым, што запрошаная зорка становіцца ў пару з тытулаваным прафесійным фігурыстам і разам яны дэманструюць сваё танцавальнае майстэрства на лёдзе. Як і раней, ацэньваць выступленні ўдзельнікаў будзе журы на чале з Таццянай Тарасавай. І тая пара, што заваюе найменшую колькасць балаў, будзе кожны раз пакідаць шоу. Аднак, на працягу першых чатырох выпускаў новага сезона гэтае правіла не будзе дзейнічаць. Усе незалежна ад вынікаў працягнуць змагацца далей (так вырашылі стваральнікі праекта, каб удзельнікі мелі магчымасць напрацаваць спартыўную форму).

Як адзначае прадзюсар праекта Ілья Авербух, вяртанне «Ледніковага перыяду» зараз вельмі дарэчы: «Праз пандэмію спартсмены цяпер вымушана прапускаюць этапы Гран-пры і адчуваюць недахоп фігурнага катання. Праект таксама дазваляе фігурыстам, якія завяршылі кар'еру, працягнуць катанне». Удзельнікамі шоу сёлета стануць Улад Тапалаў, Рэгіна Тадарэнка, Раман Кастамараў, Максім Марынін, Надзея Міхалкова, Аляксей Ціханаў і многія іншыя артысты і фігурысты.

Таксама і ў інтэлектуальным клубе знатакоў стартуюць асенія гульні 45-га сезона. Серыю гульняў «Што? Дзе? Калі?» адкрые самая маладая каманда клуба. Супраць гледачоў выступіць каманда Кірыла Ямеліна.

Не прапусціце старты любімых перадач 3 і 4 кастрычніка на тэлеканале АНТ.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 123

Чэмпіянат краіны па шашках-100 сярод мужчын скончыўся сенсацыяй. Нечакана перамог 17-гадовы майстар Захар Шыбакоў (Мар'іна Горка), на другім месцы апынуўся міжнародны гросмайстар Сяргей Насевіч (Мінск), трэцім фінішаваў міжнародны майстар Аляксей Куніца (Мінск). У жаночым чэмпіянаце з аднолькавым вынікам фінішавалі тры ўдзельніцы. Па колькасці перамог на першае месца выйшла міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч, сярэбраны медаль у майстра Вікторыі Нікалаевай. Бронза ў міжнароднага майстра Дар'і Федаровіч (усе — Мінск).

№ 96 Я. Жукоўскі — А. Куніца

Белыя простыя шашкі: 36, 37, 38, 39, 31, 34, 35, 28, 29, 30, 23 (11).

Чорныя простыя шашкі: 26, 25, 16, 17, 18, 19, 12, 14, 15, 2, 3 (11).

Чорныя правялі камбінацыю, адшукайце яе самастойна.

Паглядзіце дзве цікавыя пазіцыі з партый, згуляных у інтэрнэце на сайце PlayOK.

№ 97

№ 97 grigorian77 — viverna

Белыя простыя шашкі: f4, e5, h6.

Белыя дамкі: h8 (4).

Чорныя простыя шашкі: b2, f8.

Чорныя дамкі: a1 (3).

У белых цікавы выйгрыш.

№ 98 viverna — grigorian77

Белыя простыя шашкі: a3, e3, g3, f4, a5, e5 (6).

Чорныя простыя шашкі: c5, f6, c7, g7, b8 (5).

Спроба чорных адыграць шашку натыкнулася на камбінацыю «масток».

Пакажыце яе.

Яшчэ некалькі кампазіцый прапануем вырашыць самастойна.

№ 98 Анатоль Баланюк (г. Цепладар Адэскай вобласці, Украіна)

Белыя простыя шашкі: 50, 38, 39, 40, 33, 34, 25, 16 (8).

Чорныя простыя шашкі: 35, 27, 23, 15, 7, 10, 5 (7).

№ 99 А. Баланюк

Белыя простыя шашкі: 42, 43, 38, 31, 27, 25, 16, 18 (8).

Чорныя простыя шашкі: 36, 37, 21, 24, 15, 6, 8 (7).

№ 100 В. Варушыла

Белыя простыя шашкі: b2, g3.

Белыя дамкі: c1 (3).

Чорныя простыя шашкі: b4, h4, a5, d6, f6 (5).

№ 101 В. Варушыла

Белыя простыя шашкі: e1, e3, g3, f4, h4, a7 (6).

Чорныя простыя шашкі: b2, h2, b4, a5, c5, h6, c7, e7 (8).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: 3 кастрычніка ў РЦАП па шахматах і шашках адбудзецца турнір па шашках-64, прысвечаны 80-гадоваму юбілею экс-чэмпіёна свету Аркадзя Міронавіча Плакхіна.

Пачатак у 12.00. Арганізатар — Е. С. Меленец (8-029-916-93-60).

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 122 ад 11.09.20.

№ 91 1. d2-e3 c5:a3 2. e3:c5 d6:b4 3. f4:f8 h2:f4 4. f2-e3 f4:d2 5. e1:a1 b4-c3 6. f8-h6 a3-b2 7. h6-c1+

№ 92 1. f2-g3 h2:f4 [1...a7:e3 2.c1:b8 h2:f4 3.b8:g3]

2. c1:c5 d8-e7 3. c5:h6 a7:e3 4. h6:d2+

№ 93 1. 39-34 40:09 2. 19-13 23:43 3. 13:04 35:24 4. 04:11 06:17 5. 46:37+

№ 94 1. 37-31 40:49 2. 19-14 49:30 3. 14:05 36:27 4. 05:20 25:14 5. 35:24+

№ 95 1. 27-21 17:28 2. 33:22 34:32 3. 44-40 35:44 4. 50:39 24:35 5. 45-40 35:33 6. 22-17 12:21 7. 16:09 04:13 8. 15:04+

З лістоў чытачоў: наш чытач Уладзімір Панько з г. Камянец Брэсцкай вобласці ў сваім лісце ў рэдакцыю адзначае кампазіцыі, складзеныя В. Варушылам. «Арыгінальна, прыгожа і, як той казаў, ніводнага лішняга руху. Дзякуй».

Першымі дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск). С. Рашэцін (Ашмяны), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзель), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), В. Таўкачоў (Клімавічскі р-н).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

«Беларусь 3» віншуе Анатоля Алая з юбілеем!

Свой 80-гадовы юбілей 4 кастрычніка адзначыць сцэнарыст, кінарэжысёр, народны артыст Беларусі Анатоль АЛАЙ. Канал «Беларусь 3» па традыцыі павіншуе майстра дакументалістыкі з днём нараджэння, падрыхтаваўшы з гэтай нагоды двухтыднёвы кінамарафон з паказам яго работ.

Пра такіх, як Анатоль Алай, справядліва кажуць: прысвяціў сваё жыццё мастацтву. Адзін з самых вядомых беларускіх дакументалістаў, лаўрэат шматлікіх прафесійных узнагарод і прэмій прыйшоў у кінематограф з марай — знайсці бацьку, зніклага падчас Вялікай Айчыннай. Мара Анатоля Іванавіча здзейснілася, вынікам доўгіх пошукаў звестак стаў фільм «Чорны крумкач», але на тэму вайны, якая ўжо некалькі дзесяцігоддзяў становіцца лейтматывам амаль што кожнага яго фільма, майстар працягвае сваю даследчую размову дагэтуль.

Пачынаючы з 28 верасня ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала можна будзе пазнаёміцца з работамі Анатоля Алая, створанымі на кінастудыі «Беларусьфільм» у розныя гады. Адкрые кінапаказ стужка «Салдаты Італіі» — дакументальны фільм пра малавядомую старонку ваеннай гісторыі — лёсы італьянскіх салдат, якія адмовіліся супрацоўнічаць з гітлераўцамі ў карных экспедыцыях супраць мірнага насельніцтва нашай краіны ў 1943—1944 гадах. Фільм будзе паказаны 28 і 29 верасня.

Фільм «Бумеранг», у якім аўтары высвятляюць імя аднаго з нямецкіх афіцэраў на вядомым фотаздымку пакарання падпольшчыкаў у Мінску 26 кастрычніка 1941 года, убачым на «Беларусь 3» таксама ў аўторак. А вось працяг першай часткі кінадаследавання трагічных мінскіх падзей і высвятлення імёнаў карнікаў у фільме «Без тэрміну даўнасці. Бумеранг-2» гледачам прадставяць у эфіры 30 верасня і 2 кастрычніка.

У дзень нараджэння кінематаграфіста, 4 кастрычніка, будзе паказана адна з яго апошніх на дадзены момант работ — стужка «Доктар Шуба», прысвечаная лёсу выдатнага беларускага хірурга, былога галоўнага ўрача 1-й клінічнай бальніцы Мінска, заслужанага ўрача БССР Аляксея Шубы. Таксама ў гэты дзень у праекце «Навіны культуры» выйдзе спецыяльнае інтэрв'ю з шаноўным юбілярам, дзе ён раскажа, чым цяпер жыве і над якімі фільмамі працуе.

На тыдні з 5 кастрычніка ў эфіры «Беларусь 3» можна будзе ўбачыць яшчэ тры дакументальныя стужкі Анатоля Алая. «Сталін і Геля» раскажа пра лёс Энгельсіны Маркізавай-Дарбееваў, якая ў 6-гадовым узросце трапіла на сусветна вядомы фотаздымак з Іосіфам Сталіным. Работа майстра «Чорны крумкач» прысвечана пошукам яго бацькі — Івана Аляксеевіча Алая, ваеннага ўрача, які трапіў у палон і прапаў без звестак пад Беластокам у першыя дні вайны. Завершыць кінамарафон фільм-партрэт «Трафей сяржанта Багамолава», галоўны герой якога — ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ганаровы прафесар Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі, заслужаны агранom Рэспублікі Беларусь Аляксей Міхайлавіч Багамолаў.

Тэлеканал «Беларусь 3» і рэдакцыя газеты «Звязда» віншуюць Анатоля Алая з днём нараджэння і запрашаюць да прагляду рэтраспектывы работ майстра.

Алена ДРАПКО.

Фота з архіва «Беларусь 3».

«Восень са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2020 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 16 кастрычніка 2020 года будуць разыграны 7 здрабняльнікаў-чопераў Galaxy GL і суперпрыз — сушка для агародніны і садавіны Redmand. Вынікі будуць апублікаваныя ў газеце «Звязда» да 25 кастрычніка 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 165 газеты «Звязда» ад 26 жніўня.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.
Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2020 да 31.12.2020.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3840 ад 21.08.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года

Хатні адрас і тэлефон _____
(абавязкова) *(індэкс)*

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.15 Навіны надвор'я.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Бумеранг». 1—4-я серыі (16+).
13.05, 15.25 Меладрама «Расплата за шчасце». 1—4-я серыі (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.10 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
21.55 Серыял «След» (16+).
23.50 Арэна.
0.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.35 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.10 «Сямейныя гісторыі» (16+).
10.40 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.15 «Да пабачэння» (16+).
12.00 Драма «Трэнер» (12+).
14.10 «ЖаннаПажані» (16+).
15.00 «Калі мы дома-2» (16+).
15.30 Анімацыйна-прыгодніцкі серыял «Стыч!» (6+)
16.15 Анімацыйны фільм «Эрнэст і Селясціна: прыгоды мышкі і мядзведзя» (6+).
17.35 Баявік «Галодныя гульні: сойка-перасмешніца» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.20 «Тата папаў» (16+).
23.35 Хачу ў тэлевізар!
23.40 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня». Крэпкая каша.
8.05, 12.00, 20.20 Навіны культуры.
8.25, 12.20 «Гэты дзень».
8.30 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20 «Кадры жыцця». Мікалай Чаргінец.
10.15 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
10.40, 15.25 «Сярожа». Маст. фільм (12+).
12.55 «Наперад у мінулае».
13.25, 21.40 «Сіцыліянская абарона». Маст. фільм (12+) [СЦ].
14.55 «Навукаманія» (6+).
16.45 «Арт-гісторыі». Вучні Фердынанда Рушчыца.
17.10 «Шмат шуму з нічога». Маст. фільм (12+) [СЦ].
18.35 «Верни мне музыку». Аўтарскі вечар кампазітара Арно Бабаджаняна.
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 Апошні дзень». Міхаіл Конанаў (12+).
23.20 «Салдаты Італіі». Дак. фільм (12+).
23.45 «Камертон». Акцёр Анатоль Голуб.

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10 Веславанне на байдарках і каноэ. Кубак свету. Сегед.
8.55 Хакей. КХЛ. «Трактар» — «Дынама-Мінск».
10.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 25-ы тур. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Брэст).
12.50 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
13.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Лестэр».
15.35 Вось гэта спорт!
15.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 25-ы тур. ФК «Мінск» — ФК «Смалявічы». Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
17.50 Спартыўныя танцы. Чэмпіянат Беларусі.
19.05 На грані фолу. Футбольны агляд. Прамая трансляцыя.
20.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Фулхэм» — «Астан Віла». Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
22.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Арсенал». Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
0.05 Тэніс. «Ралан Гарос».

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
9.15 «Контуры».
10.05 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 Серыял «Сінія ночы» (12+).
12.10 «Модны прыгавор» (6+).
13.15, 22.15 Серыял «Ліст чакання» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 0.10 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 Серыял «Варажбітка» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.20 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.05 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 20.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.30, 16.50 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Міншчына».
22.05 «Глядзець усім!» (16+)
23.50 «Загадкі чалавецтва» (16+).
0.30 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00 Серыял «Жанчына ў бядзе» [СЦ] (12+).
5.25 Серыял «Жанчына ў бядзе-2» (12+).
8.50, 10.10 Серыял «Жанчына ў бядзе-3» (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок) (12+).
13.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
14.10, 17.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.15 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
18.15, 19.25 Серыял «Кулінар» [СЦ] (16+).
22.40 «Гульня ў кіно» (12+).
23.25, 0.15 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.50 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).
1.30 Серыял «Смешнае жыццё» (16+).

РТР—Беларусь

7.00 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.35 «Па сакрэце ўсяму свету».
13.00 «У людзях».
13.35 «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Пошукі доказаў» (12+).
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Спаская» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05 Драма «Зграя» (16+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 «Справа ўрачоў» (16+).
9.10, 10.20 Драма «Мёртвае сэрца» (16+).
13.20, 16.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.50 Серыял «Высокія стаўкі» (16+).
16.20, 19.40, 22.15, 23.35 Сёння. Галоўнае.
16.55 «ДНК» (16+).
18.05, 19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).
21.40 Серыял «Званар» (16+).
22.40 «НЗ.by».
23.00, 23.45 Драма «Банды» (16+).
0.10 Дэтэктыў «Пляж» (16+).

8 канал

7.00, 15.50. 18.10, 21.05, 1.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.00 «Мультпарад». «Далмацінец» (6+).
7.30, 15.55, 20.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Флэш».
8.25, 19.50 Серыял «Аднойчы ў Растове» (16+).
10.00 Дак. фільм.
10.50 Глядзім усёй сям'ёй. «Гары Потэр. Дары смерці».
13.20, 18.15 Серыял «Добрыя знакі».
14.20 Серыял «Сувенір з Адэсы».
16.30 Камедыя «Арахісавы сокал».
19.15 «Суперлато».
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.10 Меладрама «Прымадонна».
23.05 Камедыя «Вясёлая пасха».
0.35 Серыял «Бульварныя жахі» (18+).

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.20 «Лаві момант» (16+).
8.35 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
9.05 М/ф «Царэўна» (6+).
9.30 М/ф «Скубі Ду» (6+).
10.00 «Дзіцячы КВЗ» (6+).
11.00 «Рускія не смяюцца» (16+).
12.00 «Галерэя прыгажосці» (16+).
12.45 Анімацыйны фільм «Прыгоды Дэспера» (0+).
14.30, 22.00, 0.15 «Уральскія пельмені» (16+).
15.00 Фантастыка «Таймлес-3: смарагдава кніга» (12+).
17.05 Фантастыка «Элізіум: рай не на зямлі» (16+).
19.10 Баявік «Солт» (16+).

21.00 «Поўны блэкаўт» (16+).
22.40 «Справа была ўвечары» (16+).
23.45 «Наш ремонт» (16+).
1.30 «Проста кухня» (16+).
2.00 «Рогаў у справе» (16+).
2.50 «Даеш моладзь» (16+).
4.25 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Пра бегемота, які баяўся прышчэпак», «Ласкуцік і Воблака». Мультфільмы.
7.50 «Расклад на паслязаўтра». Маст. фільм [СЦ].
9.20 «Звычайны канцэрт».
9.50 «Мы — грамацеі!»
10.35 «Справа № 306». Маст. фільм.
11.55 Лісты з правінцыі. Воронежская вобласць [СЦ].
12.20, 1.30 Дыялогі пра жывёл. Заапарк Растова-на-Доне [СЦ].
13.05 «Іншыя Раманавы». «Вайна і мір вялікага князя» [СЦ].
13.35 «Гульня ў бісер».
14.15 Ілюзіён. Паляванне на ведзьмаў. «Гэта павінна здарыцца з вамі». Маст. фільм.
16.00 Больш, чым кахане. Кацярына Максімава і Рыхард Зорге [СЦ].
16.40 «Пешшу...» Дарога на Лопасню [СЦ].
17.10 «Рамантыка раманса». Андрэю Пятрову прысвячаецца...
18.10 95 гадоў з дня нараджэння Марлена Хуцыева. «Хуцыеў. Матор ідзе!» Дак. фільм [СЦ].
19.30 Навіны культуры.
20.10 95 гадоў з дня нараджэння Марлена Хуцыева. «Пасляслоўе». Маст. фільм [СЦ].
21.50 Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Лучана Павароці ў фільме-оперы «Рыгалета». Рэжысёр Жан-П'ер Понель. 1982 год.
23.55 «Адзін з трынаццаці». Маст. фільм.
2.15 «Пер Гюнт». «У свеце баек». Мультфільмы для дарослых.

Настальгія

6.00 «Да і пасля...» Год 1985-ы (12+).
7.00, 8.50, 9.45, 11.00, 13.40, 15.50, 17.45, 19.00, 20.40, 2.15, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.15 Маст. фільм «Шчанюк» (16+).
9.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00 «Колба часу».
12.00 Дак. фільм «Чорны кастрычнік. Хроніка» (18+).
14.00 Дак. фільм «Я вяртаю ваш партрэт» (12+).
15.00 «Быў час». 2008 год (16+).
16.00 «Пад знакам задыяка. Шалі» (18+).
18.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
19.20 «Вакол смеху». 1981 год (12+).
21.45 Фільм-спектакль «Сыходзячы, азірніся... «(16+).
0.00 Маст. фільм «Джамайка» (18+).

EuroSport 1

0.30, 8.30 Веласпорт. BinckBank тур (12+).
1.30, 9.50, 11.55 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
6.30,22.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
9.30, 11.40, 22.15 Тэніс. «Ралан Гарос». «Гейм, Шэт і Матс» (6+).

Кінакамедыя

0.15 Ультраамерыканцы (18+).
2.20 Шафер напракат (18+).
4.10 Заліковы выкладчык-3 (18+).
6.25 Дапамажыце стаць бацькам (16+).
8.15 SuperАлібі (16+).
10.05 Прасцячка (16+).
12.00 SuperЗять (16+).
14.00 (Не)чаканы прынц (16+).
15.35 Шпіён па суседстве (12+).

17.25 Утаймаванне свавольнага (16+).
19.30 Мы — Мілеры (16+).
21.35 Дастаць карантышку (16+).
23.35 Агент 117: місія ў Рыа (16+).

ТБ3

6.00 М/ф (6+).
8.00 «Улегцы» (12+).
8.30 Калекцыя «Беларусьфільма»: «Двое на востраве слёз». Маст. фільм (16+).
10.15 «Ратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
11.05, 2.05 Серыял «Чыстая проба» (16+).
15.00 Анімацыйны фільм «Лоракс» (0+).
16.30 Серыял «Дарога з жоўтай цэглы» (12+).
20.10 «ТБ3 вядзе расследаванне» (16+).
21.15 «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)
21.55 Маст. фільм «Царства нябеснае» (16+).
0.35 «Візіцёры». Серыял (16+).
5.20 «Без падману» (16+).

ТБ1000

7.45 Усмешка Моны Лізы (12+).
9.55, 0.10 Вобласці цемры (16+).
11.45 Знаёмцеся, Джо Блэк (16+).

15.00 Легенды восені (16+).
17.25 Пінгвіны Мадагаскара (6+).
19.00 Джуманджы (6+).
20.50 Бібліятэкар: у пошуках кап'я лёсу (16+).
22.35 Анаконда (16+).
2.00 Воблачны атлас (16+).
5.00 Двайное жыццё Чарлі Сан-Клаўда (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

7.05 Ржэўскі супраць Напалеона (16+).
8.35 Усё ці нічога (16+).
10.05 All inclusive, або Усё ўключана! (16+)
11.50 Усё ўключана-2 (12+).
13.35 Удачлівы выпадак (12+).
15.15 Сем вячэр (12+).

16.55 Лёд (12+).
19.00 Адзін удых (12+).
20.50 Са дна вяршыні (16+).
22.40 Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
0.25 Сёстры (16+).
2.10 Жанчыны супраць мужчын (18+).
3.45 30 спатканняў (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
7.35, 3.35 Аўта-SOS (16+).
8.25 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
9.20 Старажытны Кітай з вышыні птушынага палёту (16+).
11.50, 19.20 Інстынкт выжывання (16+).
14.20 Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
15.10 Служба бяспекі аэрапорта: Перу (16+).
17.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
20.10 Сіла племені (16+).
21.00 Падарожжы з Гарданам Рамзі (16+).
0.20 Фабрыка ежы (16+).
1.35 Зрабіць за адзін дзень (16+).
2.00, 5.05 Асушыць акіян (16+).

Discovery

8.00 Махінатары (12+).
8.45, 21.2 Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
9.10 Смяротны ўлоў: даругай бацькі (16+).
10.00 Аляска: сям'я з лесу (16+).
10.50, 19.20 Як гэта ўладкавана? (12+)
11.41 Голыя і напалоханыя (16+).
13.23, 23.09 Дальнабойшчык у Інданезіі (12+).
14.14, 7.14 Легенды дзікай прыроды (12+).
15.05 Браты Дызель (16+).
20.11, 5.42 Як гэта зроблена? (12+)
21.27 Не спрабуйце паўтарыць (16+).
0.00, 6.28 Вартавыя падземкі (12+).
0.51 Олі Сміт: па слядах элю (16+).
1.42 Паляўнічыя на старызну (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.45 Меладрама «Мае дарагія» (12+).
8.20 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00. 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.45 Гісторыі выратавання (12+).
10.20 Родныя людзі (6+).
10.40 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
11.15 Вакол планеты.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Меладрама «Блюз для верасня» (16+).
14.25 Маршрут пабудаваны (12+).
15.15 «1418 дзён. Гісторыя Перамогі». Хранікальна-дакументальны фільм (12+).
15.55 Адзін дзень (12+).
16.25, 19.10 Меладрама «Лепш за ўсіх». 1—4-я серыі (16+).
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
22.05 Меладрама «Вучылка». 1—4-я серыі (16+).

Беларусь 2

7.05 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).
8.45 Анімацыйна-прыгодніцкі серыял «Стыч!» (6+)
9.25, 19.40 Тэлебарометр.
9.30 «Да пабачэння» (16+).
10.25 «Чалавек-невідзімка» (16+).
11.25 «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
12.20 Драма «Накдаўн» (12+).
14.45 «Тата папаў» (16+).
17.05 «Вежа» (12+).
17.55 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
20.10 «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
21.15 Фантастыка «Згублены горад Z» (12+).
23.35 Меладрама «Сямейныя каштоўнасці» (12+).

Беларусь 3

7.35 «Святыні Беларусі».
8.00, 13.20, 20.20 Навіны культуры.
8.20, 13.40 «Гэты дзень».
8.25 «Дайце кнігу скаргаў». Маст. фільм (12+).
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Страва з куранят з агрэстам.
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.45 «Папярэдняе расследаванне». Маст. фільм (12+).
13.45 «Доктар Шуба». Дак. фільм (12+).
14.25 «Адзін шанц з тысячы». Маст. фільм (16+).
15.45 Жорж Бізэ. «Кармэн». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.
18.15 «Вуліца поўная нечаканасцяў». Маст. фільм (12+) [СЦ].
19.25 «Кадры жыцця». Уладзімір Пракапцоў.
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Ясенін». Серыял (16+).

Беларусь 5

6.40, 10.00, 13.50, 18.30, 21.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
8.25 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. БЧ (Гомель) — МФК «Ліда».
11.50 Піт-стоп.
12.20 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Віктория» (Смалявічы) — ХК «Рытм» (Гродна). Прамая трансляцыя.
15.50, 23.00 Тэніс. «Ралан Гарос». Прамая трансляцыя.
17.00 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Цмокі-Мінск». Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
20.20 Вынікі тыдня.

АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ], **18.00** Нашы навіны.
7.15 «Здароўе» (16+).
8.10 «Жыццё іншых» (12+).
9.15 «Нядзельная пропаведзь» [СЦ].
9.30 «Метэагід».
9.50 Фільм «Жанчына з ліле-ямі» (16+).
11.35 «Бачылі відэа?» (6+)
13.50 «На дачу!» (6+)
15.00 «Няхай гаворыць». Надзея Бабкіна (12+).
16.20 Юбілейны канцэрт Надзеі Бабкінай (12+).
18.20 «Тры акорды». Новы сезон (16+).
20.00 «Контуры».
21.20 «Што? Дзе? Калі?». Восеньская серыя гульняў (16+).
22.35 «Спартклуб» (16+).
22.55 Фільм «Уцёкі» (16+).

СТБ

6.35, 0.05 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
8.15 Дакументальны праект (16+).
9.10 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
11.00, 20.50 Дакументальны спецпраект (16+).
12.55, 13.40, 16.40 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
22.30 «Засакрэчаныя спісы» (16+).

МІР

5.00 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
5.10 Мультфільмы (0+).
6.40 Маст. фільм «Добры дзень, я ваша цётка» (6+).
8.50 «Любімыя акцёры 2.0». Армен Джыгарханян (12+).
9.25 «ФазэндаЛайф» (12+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 Маст. фільм «Знахар» [СЦ] (16+).

13.00 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе» [СЦ] (0+).
14.45, 16.15, 19.30 Серыял «Вялікі перапынак» [СЦ] (0+).
18.30, 0.00 «Разам».
21.45, 1.00 Маст. фільм «Танцор дыска» (12+).
01.35 Серыял «Міф пра ідэальнага мужчыну» [СЦ] (0+).

РТР—Беларусь

7.00 Маст. фільм «Па той бок шчасця» (12+).
10.35, 11.30 Маст. фільм «Незабудкі» (12+).
11.00 Вестк.
14.40 Маст. фільм «Госця з мінулага» (12+).
16.30 Маст. фільм «Спакушэнне спадчынай» (12+).
20.00 Вестк тыдня.
21.25 Маст. фільм «Дапушчальныя ахвяры» (12+).
23.00 «У людзях».
23.30 Масква. Крэмль. Пуцін.
0.10 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
6.45 «50 рэцэптаў першага» (12+).
7.20 «Хто ў доме гаспадар?» (12+)
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «24 пытанні» (12+).
8.50 Беларусы (6+).
9.25 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.20 «Першая перадача» (16+).
10.50 «Цуд тэхнікі» (12+).
11.35 «Дачны адказ» (0+).
12.35 Гісторыі выратавання (12+).
13.05 «НашСпажыўНагляд» (16+).
14.00 Баявік «Непераможны» (16+).
16.15 За гранню (16+).
16.35 «Следства вялі...» (16+)
18.05 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.05 «Зоркі сышліся» (16+).
21.20 Ты не паверыш! (16+)
22.15 «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).

8 канал

7.00, 14.00, 17.05, 21.10 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад». «Іван Царэвіч і Шэры Воўк».
8.35 «Прыколы 13-й школы» (6+).
8.40 Драма «Зорка чароўнага шчасця» (12+).
11.25 Драма «Супраць Фараоны».
14.05 «Глядзім усёй сям'ёй». «Садко».
8.55 «Начны званок». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.35 XX стагоддзе. «Бенефіс Веры Васільевай». Рэжысёр Я. Гінзбург. 1974 год.
12.05 Юбілей Веры Васільевай. «Вяселле з пасагам». Маст. фільм [СЦ].
14.05 Колер часу. Васіль Паленаў. «Маскоўскі дворык».
14.10 «Гісторыя Сямёнаўскага палка, ці Небывалае бывае». Дак. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 Юбілей Веры Васільевай. «2 Вернік 2».
16.35 Вера Васільева ў спектаклі Тэатра сатыры «Фатальная цяга». Пастаноўка Андрэя Жыцінкіна. Запіс 2016 года. [СЦ].
18.35 Прыступкі цывілізацыі. «Якія апярэдзілі Калумба. Сапраўдныя першаадкрывальнікі Амерыкі». Дак. фільм [СЦ].
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Абсалютны слых.
21.25 Астравы. Аляксандр Астроўскі.
22.10 «Пікаса». Маст. фільм (16+).
23.00 «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
1.30 Майстар-клас. Захар Брон.
2.30 «Дом мастацтваў». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 Маст. фільм «Часне-чакае» (16+).
8.30, 9.45, 11.00, 12.55, 14.35, 15.45, 17.00, 20.00, 21.45, 23.00, 2.45, 3.45 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00. 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
11.20, 17.20 Дак. фільм «Цэхавікі. Небяспечная справа» (16+).
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Чорны кастрычнік 93 года» (16+).
13.20 Маст. фільм «Сярод тысячы дарог...» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+).
19.00 Маст. фільм «Людзі і манекены» (12+).
20.40 Маст. фільм «Агульная сцяна» (12+).
23.45 «Сядзі і глядзі» (16+).
1.00 Маст. фільм «Матылёк» (12+).
1.15 «Ранішняя пошта». 1986 год (12+).
1.45 «Погляд. Пераварот». 1991 год (16+).
4.00 Фільм-спектакль «З запісак Лапаціна» (16+).

EuroSport 1

0.00 Аўтагонкі. WTCR. Нюрбургрынг (12+).
0.30 Мотагонкі. FIM Endurance (12+).
1.05 Снукер. European Masters (6+).
2.30, 9.45, 22.30 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
7.30 Веласпорт. Флэш Валонь — 2019 (12+).
8.30 Веласпорт. BinckBank тур (12+).
9.30, 22.15 Тэніс. «Ралан Гарос». «Гейм, Шэт і Матс» (6+).

Кінакамедыя

1.20 Красуня на ўсю галаву (16+).
3.45 Сакавіцкія каты (16+).
5.35 Шафер напракат (18+).
7.30 Агент 117: місія ў Рыа (16+).

9.25 Утаймаванне свавольнага (16+).
11.25 Заліковы выкладчык-3 (18+).
13.45 Прасцячка (16+).
15.40 SuperАлібі (16+).
17.30 Дастаць карантышку (16+).
19.30 Завадатары (16+).
21.20 Чумавыя боты (16+).
23.20 Аферысты нехаця (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.30 М/ф (6+).
9.05, 15.30, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
10.05, 17.30 «Старац» (16+).
11.10, 18.35 «Сляпая» (16+).
12.15, 19.40 «Варажбітка» (12+).
13.20 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.20, 2.45 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.30, 3.40 «Знакі лёсу» (16+).
20.50 «Косці». Серыял (16+).
22.40 «Візіцёры». Серыял (16+).
23.40 «10 самых» (16+).
0.20 «Лінія абароны» (16+).
0.55 «Помні мяне». Маст. фільм (16+).

ТБ1000

7.00 Вобласці цемры (16+).
8.45 Сем жыццяў (16+).
10.50 Дзіця чалавечае (16+).
12.40 Сацыяльная сетка (16+).
14.55 Разумніца Уіл Хантынг (16+).
17.10 Мацільда (6+).
19.00 Маленькі Манхэтэн (12+).
20.35 Цуд (12+).
22.35 Двайное жыццё Чарлі Сан-Клаўда (16+).
0.20 Чароўная краіна (12+).
2.25 Капітан Крук (12+).
5.00 Правілы вінаробаў (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

7.10 Сем вячэр (12+).
8.40 Адной левай (12+).
10.05, 0.40 Пра што гавораць мужчыны (16+).
11.45, 2.20 Пра што яшчэ кажуць мужчыны (16+).
13.30, 19.00 Адваротны бок Месяца (16+).
15.40 Сёстры (16+).
17.10 Удачлівы выпадак (12+).
20.55, 3.55 Дзень радыё (16+).
22.45 Дзень выбараў-2 (12+).

National Geographic

6.00, 12.30, 16.45 Фабрыка ежы (16+).
6.25, 11.40, 15.55, 20.05 Зрабіць за адзін дзень (16+).
7.20, 13.20, 17.35 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
8.10 Каралі шахт (16+).
9.00 Зона будаўніцтва (16+).
9.55 Самыя лепшыя суперкары (16+).
10.45 Секунды да катастрофы (16+).
14.10, 18.25, 4.55 АўтаSOS (16+).
15.00, 19.15, 1.55 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00 Віні Джонс: самыя крутыя сюжэты пра Расію (16+).
23.30 Космас: магчымыя сусветы (16+).
0.20 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
2.40 Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
4.10 Неверагодныя машыны (16+).
5.40 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 3.24 Веру-не-веру (12+).
8.45 Бітва за нерухомасць (12+).
9.35, 16.21, 22.18 Махінатары (12+).
10.25, 17.12, 21.27, 5.19 Як гэта ўладкавана? (12+).
11.15, 20.36, 5.42 Паляўнічыя на старызну (12+).
12.06, 19.45, 4.10 Браты Дызель (12+).
12.57 Скрыўленне часу (16+).
13.48 Як гэта зроблена? (12+).
14.39 Стальныя хлопцы (12+).
15.30 Выгадная старызна (12+).
18.03 Дальнабойшчыкі (12+).
18.54 Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
23.09 Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
0.00, 6.28 Голыя і напалоханыя (16+).
1.42 Музейныя загадкі (12+).
2.33 Каралі грузавікоў (12+).
4.56 Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
7.14 Выбуховае шоу (16+).

чацвер, 1 кастрычніка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45, 12.10, 18.30, 19.20 Меладрама «Бумеранг» (16+).
13.05, 14.45, 15.25 Меладрама «Спытайце ў восені» (16+).
13.55 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ].
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.25 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
0.10 Сфера інтарэсаў.
0.50 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.15 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 23.00 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.55, 18.25 Серыял «Гатэль «Таледа» (16+).
12.40, 0.05 Серыял «Анатомія страсці» (16+).
13.25 «Арол і рэшка. Маркі сезон» (16+).
14.20 «Муж напракат» (16+).
15.15 Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна (6+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «Пін_код» (12+).
16.25 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).
17.20 «Супержонка (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.15 «Вяселле ўсляпую» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Карась запечаны.
8.05, 12.00, 18.50 Навіны культуры.
8.25, 12.15 «Гэты дзень».
8.30, 17.20 «Выйсці замуж за капітана». Маст. фільм (12+).
10.00, 12.20, 20.10 «Гукі ў футляры».
10.30, 15.55 «Мама выйшла замуж». Маст. фільм (12+).
12.45 «Апошні дзень». Алег Яфрэмаў (12+).
13.20, 21.05 «Дзень добры, я ваша цётка!» Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.00 «Майстры і куміры». Аляксандр Анісімаў.
19.10 Гала-канцэрт, прысвечаны адкрыццю філарманічнага сезона «Сустрэча з класікай».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.45 Гала-канцэрт, прысвечаны адкрыццю філарманічнага сезона «Шэдэўры сусветнай класікі».

Беларусь 5

7.00, 14.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ.
8.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Дзённік.
9.25 Між іншым.
9.45 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Мяшкоў Брэст» (Беларусь) — ПСЖ (Францыя).
11.25 Матч-пойнт.
12.0, 23.25 Тэніс. «Ралан Гарос». Прамая трансляцыя.
15.30 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Енісей» (Краснаярск) — «Цмокі-Мінск». Прамая трансляцыя.
17.20 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 23-і тур. РЦАР-БДУ — ФК «Слуцк».
18.30 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама-Мінск». Прамая трансляцыя. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
20.50 Слэм-данк.
21.15 Фактар сілы.
21.45 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Нант» (Францыя) — «Барселона» (Іспанія). Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.20** Нашы навіны.
9.15 «Аб'ектыўНА» (16+)
10.15 «Жыць здорава!» (16+).
11.15 Серыял «Сінія ночы» (12+)
12.10 «Модны прыгавор» (6+).
13.15, 22.40 Серыял «Пакаёўка» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 0.30 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.40 Серыял «Варажбітка» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.55 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.40, 0.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.05 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 20.50 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).
17.50 Дакументальны спецпраект (16+).
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Міншчына».
20.30 «Спецыяльны рэпартаж СТБ».

МІР

5.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць» (16+).
7.35, 10.10, 18.15, 19.25 Серыял «Кулінар» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 17.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.15 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
22.40, 3.05 «Гульня ў кіно» (12+).
23.25, 0.15 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.50 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).
3.35 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
4.15 Серыял «Выходжу цябе шукаць» (16+).

РТР—Беларусь

7.00 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.35 «Лёс чалавека» (12+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Пошукі доказаў» (12+).
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Спаская» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 «Гарады Беларусі» (6+).
6.4016.20, 19.40, 22.15, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.50 «Здароўе» (12+).
7.30, 8.25 «Справа ўрачоў» (16+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.45 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
9.35, 22.40 «НЗ.by».
10.20, 23.00, 23.45 Серыял «Вонкавае назіранне» (16+).
11.10 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
13.20, 16.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.50 Серыял «Высокія стаўкі» (16+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.05, 19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).
21.40 Серыял «Званар» (16+).
0.05 Дэтэктыў «Пляж» (16+).

8 канал

7.00, 15.35, 21.10, 1.20 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 15.45 Мультсерыял «Далмацінец» (6+).
7.30, 15.40, 20.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Флэш».
8.30, 19.15 Серыял «Аднойчы ў Растове» (16+).
10.00 Дак. фільм.
10.45 Трылер «Вострай пракляты» (18+).
13.05 Серыял «Добрыя знакі».
14.00 Серыял «Сувенір з Адэсы».
16.10 Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі» (12+).
17.55 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
18.10 Серыял «Вядзьмак».
19.10 «Надвор'е».
20.55 «Вечарніца» (6+).
21.15 Дэтэктыў «Залатая страла» (16+).
0.15 Серыял «Хадзячыя мерцвякі» (18+).

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.20 «Лаві момант» (16+).
8.35, 16.00 Серыял «Вароніны» (12+).
10.05, 23.00 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
11.35 «Уральскія пельмені». Па цешчыным загадзе (16+).
13.05, 0.25 Серыял «Дзяўчынкі не здаюцца» (16+).
14.05, 2.25 Серыял «Маладзёжка» (16+).
17.30 «Уральскія пельмені» (16+).
18.35 Серыял «Карані» (16+).
20.30 Серыял «Кухня. Вайна за гатэль» (16+).
21.30 «Уральскія пельмені». Каўбоі тут ціхія (16+).
1.15 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
4.00 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква нямецкая.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 23.50 «Якія апярэдзілі Калумба. Сапраўдныя першаадкрывальнікі Амерыкі». Дак. фільм [СЦ].
8.35 Колер часу. Васіль Кандзінскі. «Жоўты гук».
8.50, 16.35 «Сваё шчасце». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.45 XX стагоддзе. «Кінапанарама. Нам 30 гадоў». 1992 год.
12.25, 22.10 «Пікаса». Маст. фільм (16+).
13.15, 2.40 Прыгожая планета.
13.30 Абсалютны слых.
14.10 «Гісторыя Праабражэнскага палка, або Жалезная сцяна». Дак. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Мая любоў — Расія! «Невядомы Плёс» [СЦ].
15.50 Больш, чым каханне. Дзмітрый і Зінаіда Ліхачовы.
17.45, 1.55 Майстар-клас. Дзмітрый Аляксееў.
18.35 Прыступкі цывілізацыі. «Таямніцы кельцкіх магільняў». Дак. фільм [СЦ].
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Кіно пра кіно. «Экіпаж». Запас трываласці». Дак. фільм [СЦ].
21.25 «Энігма».
23.00 «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].

Настальгія

6.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Чорны кастрычнік 93 года» (16+).
6.55, 8.35, 9.45, 11.00, 14.00, 15.45, 17.00, 20.15, 21.45, 23.00, 2.30, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Сярод тысячы дарог...» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.20, 5.20 Дак. фільм «Цэхавікі. Небяспечная справа» (16+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+).
13.00 Маст. фільм «Людзі і манекены» (12+).
14.40 Маст. фільм «Агульная сцяна» (12+).
17.45 «Сядзі і глядзі» (16+).
18.00 Маст. фільм «Джамайка» (18+).
0.00 Маст. фільм «Часне-чакае» (16+).

EuroSport 1

0.35, 8.30 Веласпорт. BinckBank тур (12+).
1.30, 7.30 Веласпорт. Флэш Валонь (12+).
2.30, 9.45, 22.30 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
6.30 Веласпорт. Чэмпіянат свету (12+).
9.30, 22.15 Тэніс. «Ралан Гарос». «Гейм, Шэт і Матс» (6+).

Кінакамедыя

1.00 Ультраамерыканцы (18+).
2.55 Забі мяне тройчы (18+).
4.25 Загадай жаданне (12+).
6.05 Сексу шмат не бывае (18+).
8.05 Тата-дасвідос (16+).
10.15 Пяты элемент (12+).

12.40 Завадатары (16+).
14.30 Сабрына (12+).
17.00 Робін Гуд (16+).
19.30 Шпіён па суседстве (12+).
21.20 Як займацца каханнем па-ангельску (18+).
23.10 Дачка майго боса (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.45 М/ф (6+).
8.25, 23.35 «Улегцы» (12+).
9.00, 15.25, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
10.00, 17.25 «Старац» (16+).
11.05, 18.30 «Сляпая» (16+).
12.10, 19.35 «Варажбітка» (12+).
13.15, 3.40 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.15 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.25, 3.10 «Знакі лёсу» (16+).
20.45 «Косці». Серыял (16+).
22.35 «Візіцёры». Серыял (16+).
0.15 «Знак якасці» (16+).
1.00 «Чалавек у жалезнай масцы». Маст. фільм (16+).

ТБ1000

7.15 Чароўная краіна (12+).
9.10 Капітан Крук (12+).
11.40 Двайное жыццё Чарлі Сан-Клаўда (16+).
13.25 Цуд (12+).
15.25 Маленькі Манхэтэн (12+).
17.05, 3.10 Якія не спяць у Сіэтле (6+).
19.00, 5.00 Лепш не бывае (12+).
21.30 Дзюплекс (16+).
23.05 Эма (16+).
1.10 Вялікія вочы (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.10 Удачлівы выпадак (12+).
8.00 Любоў-маркоў (12+).
10.00 Любоў-маркоў-2 (12+).
11.40 Любоў-маркоў-3 (12+).
13.25, 19.00 Адваротны бок Месяца (16+).
15.25 Дзень радыё (16+).
17.15 30 спатканняў (16+).
21.00 Пра што гавораць мужчыны (16+).

22.40 Пра што яшчэ кажуць мужчыны (16+).
0.30 Жанчыны супраць мужчын (18+).
1.55 Лаві момант (16+).
3.10 Рэжэўскі супраць Напалеона (16+).
4.30 Пікавая дама: Залюстроўе (16+).
5.55 Кухня ў Парыжы (12+).

National Geographic

6.00 Фабрыка ежы (16+).
6.15, 10.55, 15.05, 19.15 Зрабіць за адзін дзень (16+).
6.40, 12.35, 16.45 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
7.30 Каралі шахт (16+).
8.20 Цуды інжынерыі (16+).
9.10 Інжынерныя ідэі (16+).
10.05 Гісторыі выратавання (16+).
11.45, 15.55 Віні Джонс: самыя крутыя сюжэты пра Расію (16+).
13.25, 17.40 Аўта-SOS (16+).
14.15, 18.25, 20.10, 1.50 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.50 Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія (16+).
0.20 Дзіўная Другая сусветная (16+).
4.05 Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
4.55 Неверагодныя машыны (16+).
5.40 Навуковыя глупствы (16+).

Discovery

8.00, 3.24 Веру-не-веру (12+).
8.45, 18.03 Бітва за нерухомасць (12+).
9.35, 17.12, 22.18 Махінатары (12+).
10.25, 15.30, 21.27, 5.19 Як гэта ўладкавана? (12+).
11.15, 11.15 Паляўнічыя на склады (16+).
12.06, 19.45, 4.10 Браты Дызель (12+).
12.57 Скрыўленне часу (16+).
13.48 Мегаперавозкі (12+).
16.21, 1.42 Музейныя загадкі (12+).
18.54 Дальнабойшчыкі (16+).
20.36, 5.42 Паляўнічыя на старызну (12+).
23.09 Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
0.00 Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
0.51 Мужчына, жанчына, прырода (12+).
2.33 Каралі грузавікоў (12+).
4.56 Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
6.28 Голыя і напалоханыя (16+).

СТАРОЕ ЖЫЛЛЁ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў...

У аўторак у цэнтры ўвагі членаў прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў быў Указ № 357, які датычыцца жылля, што стаіць пустое і не выкарыстоўваецца.

Не лішнім будзе нагадаць, што работу з праблемным жыллём распачалі яшчэ ў лютым 2006-га. Згодна з Указам № 70, патрабавалася скараціць колькасць непатрэбнага. І сельскія выканкамы Віцебшчыны пасля карпатлівага вывучэння налічылі больш за 25 тысяч такіх дамоў. Менавіта тады была праведзена значная работа, каб адшукаць спадчыннікаў. І тысячы даўно ўжо гарадскіх жыхароў, і нямала замежнікаў «раптам» успомнілі пра свой кавалак зямлі. Пачалі думаць, што з ім рабіць. А ў лютым 2012-га працягам нарматыўнай базы стаў Указ № 100.

Тэма актуальная і дагэтуль. Насельніцтва не толькі на Віцебшчыне ўсё больш становіцца гарадскім: людзей у вёсцы, на жаль, усё меней. Адпаведна, «метры» ў глыбінцы нярэдка застаюцца незапатрабаваныя, без гаспадароў і прэтэндэнтаў на выкарыстанне.

Дарэчы, на мерапрыемстве была агучана цікавая статыстыка, якая датычыцца не толькі самай паўночнай вобласці, але і краіны ў цэлым. Калі ў 1991-м у вёсках і пасёлках жылі 3,3 мільёна чалавек, цяпер толькі каля двух мільёнаў...

Пытанне абмяркоўвалася не па прынцыпе пратакольнага мерапрыемства са справаздачамі — апошняе ператварылася ў дыскусію. Усе прапановы, заўвагі, спрэчныя пытанні стануць нагодай для выпрацоўкі адзіных стратэгій, падыходаў, алгарытмаў дзеяння, падкрэсліў **кіраўнік «парламента Прыдзвінскага краю» Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Ён нагадаў, што сёлета завяршаецца трохгоддзе малой радзімы. Таму трэба актывізавацца, каб у кожнага дома ў сельскай мясцовасці быў прыстойны выгляд. Калі няма гаспадароў, іх нашчадкаў, трэба прапанаваць жыллё іншым, напрыклад, пад дачы, сельскі бізнес, фермерам, каб развіваць жывёлу, птушку. Калі з часам дом разбураецца, яго трэба зруйнаваць. Усё проста і лагічна. А на месцы былых «метраў», калі іх знесці, можна распачаць апрацоўку зямлі, штосьці пабудаваць «з нуля»...

Што да колькасці выяўленага безгаспадарнага жылля на Віцебшчыне на сённяшні дзень, то такіх дамоў каля 2,1 тысячы.

Няма агульных падыходаў, канстатаваў Уладзімір Цярэнцьеў. І ў выніку адчуваецца незразумелы дысананс. У прыватнасці, чаму ў Аршанскім раёне выявілі пад дзвесце непатрэбных дамоў, а ў суседнім Дубровенскім — толькі адзін?

Паводле інфармацыі **начальніка ўпраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама Ігара ЛЕВЯНКОВА,** з пачатку рэалізацыі ўказа па зносе старых і пустуючых дамоў, а гэта каля пятнаццаці гадоў таму, іх стала менш на амаль што 17 тысяч. Агульная плошча зямельных участкаў набліжалася да 2,5 тысячы гектараў.

Начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Сяргей МЯЛЕШКІН катэгарычны ў размове пра тых старшынь сельскіх Саветаў, якія не разумеюць важнасці своечасовага ўліку, зносу безгаспадарных аб'ектаў. Такіх ён патрабуе пазбаўляць займаемай пасады. Прывёў прыклады. У прыватнасці, кіраўніку мясцовай прадстаўнічай улады тры разы тлумачылі, што трэба зрабіць, а ніякіх спроб рэалізаваць тое, не было. І што з такім «адказным» рабіць? Няўжо не разумее, што дом без гаспадара — гэта месца, дзе могуць траўміравацца ў тым ліку і дзеці, якія вырашылі там пагуляць... А летась пры тушэнні пажару на такім аб'екце ў Пастаўскім раёне загінуў выратавальнік. Без бацькі засталіся двое дзяцей...

На завяршэнні пасяджэння прэзідыума старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў падкрэсліў, што яно стане пачаткам больш плённай працы. Самыя цікавыя даклады ўвойдуць у брашуру, якая без перабольшвання стане настольнай для выканаўцаў, дапаможа ўлічыць усе нюансы.

Дарэчы, у Гарадоцкім раёне, як паведаміла Святлана Зуева, старшыня райсавета, такую «шпаргалку» для адказных асоб ужо распрацавалі. Цяпер «вераснёўскія тэзісы» стануць асновай для публікацыі больш грунтоўнага даследавання на дадзеную тэму.

На сайтах органаў мясцовай улады вырашана рэкламаваць такое жыллё для продажу з фота, усёй неабходнай інфармацыяй і юрыдычнымі нюансамі. Запланавана арганізаваць экскурсію для дэпутатаў у раёны Беларусі, дзе найбольш удала пастаўлена работа з безгаспадарным жыллём.

«МС» будзе і далей адсочваць, як рэалізуецца заканадаўства ў дачыненні да навядзення парадку на зямлі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЛЕКІ ВЫКІДАЕМ АСОБНА

У сталіцы з'явяцца новыя падыходы да ўтылізацыі адходаў

У Мінску з красавіка 2021 года будзе ўкаранены раздзельны збор лекаў, таблетак, пілюль, розных медыцынскіх прэпаратаў, у якіх скончыўся тэрмін выкарыстання.

Такое рашэнне прынялі сталічныя дэпутаты на 20-й сесіі Мінскага гарадскога Савета. Паводле слоў яго старшыні Андрэя Бугрова, дэпутаты аднагалосна ўхвалілі праект пастановы «Аб абыходжанні з адходамі пратэрмінаваных лекавых сродкаў».

Прыняццю гэтага рашэння папярэднічала працяглая і сур'ёзная работа. Дэпутаты імкнуліся ўсебакова даследаваць згаданае пытанне, бо яго пэўная незвычайнасць насцярожвала: як правільна арганізаваць працэс? Збіраць металалом, макулатуру, бутэлькі з пластыку і шкла, аўтамабільныя акумулятары — справа звыклая. А вось лекі... Тут трэба было ўзважыць усе плюсы і мінусы.

А пытанне наспела. Дэпутатам Мінгарсавета было відавочна, што ўтылізацыя пратэрмінаваных лекавых сродкаў разам са звычайнымі бытавымі адходамі ўяўляе схаваную пагрозу для здароўя мінчан. Такія лекі ў глебе, у пластах грунтовых вод могуць выклікаць таксічныя рэакцыі, якія потым нагадаюць аб сабе будучым пакаленням нечаканымі хваробамі.

Выказаць сваё меркаванне па гэтай праблеме на сесію дэпутаты запрасілі начальніка ўпраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Уладзіміра Лебедзя. Той расказаў аб мяркуемых захадах.

У прыватнасці, плануецца распачаць збор лекавых сродкаў у аптэках, паліклініках, бальніцах, амбулаторыях і ў іншых установах, дзе мінчане атрымліваюць медыцынскія паслугі, праходзяць курсы лячэння. У спецыяльныя кантэйнеры іх пацыенты, наведвальнікі змогуць у якасці адходаў складіраваць непатрэбныя ўжо лекі і медпрэпараты.

Дэпутатамі пастаўлена задача адпаведным службам Мінгарвыканкама выпрацаваць дакладны алгарытм дзеянняў па ўтылізацыі такіх небяспечных адходаў, арганізаваць каардынацыю работ, а таксама вызначыць адказных асоб за збор, выдаленне і абязшкоджванне пратэрмінаваных лекаў на тэрыторыі сталіцы.

Як паведаміў Андрэй Бугроў, на 20-й сесіі Мінскага гарадскога Савета быў прыняты яшчэ шэраг важных рашэнняў. Дэпутаты далі згоду на павелічэнне агульнага аб'ёму інвестыцыйнай праграмы на 21 мільён рублёў. Грошы пойдуць на завяршэнне будаўніцтва важных сацыяльных аб'ектаў: могілак «Лясная» і пад'язной дарогі да іх, працягу ўзвядзення адной мінскай вуліцы.

Дэпутаты Мінгарсавета ўнеслі і змены ў бюджэт сталіцы. Яго сродкі пераразмеркавалі ў межах удакладненага гадавога аб'ёму выдаткаў.

У выніку будзе дадаткова накіравана 96,9 мільёна рублёў на ахову здароўя. Напрыклад, 2,2 мільёна пойдуць на аплату транспартных паслуг для перавозкі пацыентаў, хворых на каранавірус. Больш як 10 мільёнаў выдаткавана на аплату лекавых сродкаў і перавязачных матэрыялаў на льготных умовах ці ўвогуле бесплатна для асобных катэгорый грамадзян і г. д.

Леанід ТУГАРЫН.

РОБІМ РАЗАМ

І НАВАТ З АЎТАМАБІЛЕМ

Яшчэ некалькі двароў Краснаполля сталі ўтульныя дзякуючы ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання з уладай

Нядаўна тут на дзіцячых пляцоўках у раёне шматпавярховай забудовы па вуліцах Курака і Ленінскай з'явіліся новыя гульнявыя комплексы і абсталяванне. Жыхары зрабілі гэту прыгажосць з дапамогай камунальнікаў і пры фінансавай падтрымцы Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Скарыстацца такой дапамогай ім падказала **старшыня раённага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН**. Падчас прыёму грамадзян да яе звярнуліся маладыя маці — прадстаўніцы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з просьбай дапамагчы ў абнаўленні гульнявога абсталявання для дзяцей. Частка яго прыйшла ў непрыдатнасць, а тое, што яшчэ можна эксплуатаваць, карыстаецца такім попытам, што дзецям гэтага не хапае. Нават на арэлі збіраецца чарга.

Старшыня райсавета прапанавала вырашыць пытанне сумеснымі намаганнямі: каб атрымаць грашовую дапамогу, жыхары таксама павінны ўнесці пасільны ўклад у справу. Жанчыны пагадзіліся і данеслі гэту інфармацыю да жыхароў. Грамадскую ініцыятыву, дарэчы, падтрымалі і сама Анжаліка Гоман як дэпутат па Ленінскай выбарчай акрузе № 10, і дэпутат райсавета па Ленінскай выбарчай акрузе № 11 Людміла Палавая. Усяго жыхары сабралі 640 рублёў, унёсак жа Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў склаў 1634 рублі.

Ініцыятыўныя мамы разам з камунальнікамі падабралі неабходнае абсталяванне, якое «Жылкамгас» устанавіў бясплатна. Дзеці былі на сёмым небе ад радасці і адвялі душу на поўнай праграме. Нават дзятва з суседніх двароў прыбегла, каб ацаніць набытак. Па просьбе жыхароў камунальнікі зрабілі новае вечка для пясочніцы і замянілі пясок. А заадно падрамантавалі гульнявыя аб'екты і зрабілі дадатковую лаўку. Па ініцыятыве старшыні райвыканкама Аляксандра Трушкіна майстры «Жылкамгаса» сабралі з дрэва і падручных матэрыялаў дзіцячы аўтамабіль.

Асабліва задаволеныя зменамі маладыя маці. Раней ім з маленькімі дзецьмі, якім крыху больш чым год, даводзілася хадзіць у парк, а гэта не зусім зручна. Зараз усё побач. І яны ўдзячны ўсім, хто прыклаў да гэтага свае намаганні. Ініцыятары так натхніліся вынікамі, што вырашылі і далей удасканальваць сваю дваровую тэрыторыю, каб яна стала яшчэ больш прыгожай і прыстасаванай для адпачынку. Дэпутаты абяцаюць іх у гэтым падтрымаць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота з архіва Краснапольскага райсавета дэпутатаў.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

Тысячы кветак упрыгожаць Мінск

Сёлета да восеньскага кветкавага афармлення сталіцы вырашылі падысці па-новаму.

Як паведамляе Тэлеграм-канал «Мінск. Афіцыйна», ужо пачаліся пасадкі хрызантэм на асноўных магістралях і ў парках сталіцы. Мінск упрыгожаць тры тысячы бэзавых, жоўтых, белых, аранжавых і бардовых кветак. Іх можна ўбачыць у зялёнай зоне каля гасцініцы «Планета», у парку Перамогі, каля стэлы «Мінск — Горад-герой», у парку каля крыніцы ў Вяснянцы і ў іншых месцах.

Дадасць фарбаў у гарадскі пейзаж і восеньская фіялка. Сёлета яе ў сталічным азеляненні выкарысталі ўпершыню за шмат гадоў — на вуліцах з'явіліся 25 тысяч кветак. Расліна будзе квітнець да самай позняй восені, радуючы вока гараджан і гасцей сталіцы на плошчах Перамогі і Незалежнасці, вуліцы Прытыцкага і ў іншых месцах.

Найлепшы сталічны двор

Ім стаў двор па вуліцы Ламаносава, 8

Да такой высновы прыйшло журы агляду-конкурсу на найлепшае добраўпарадкаванне, санітарнае ўтрыманне і архітэктурна-эстэтычны стан жыллёвага фонду Мінска. Як паведамляе Тэлеграм-канал «Мінск. Афіцыйна», 2-е і 3-е месцы ў намінацыі «Лепшы двор» занялі двары на праспекце Ракасоўскага, 39 і вуліцы Ташкенцкай, 20 (корпус 2).

Таксама журы конкурсу аціаніла і найлепшыя сталічныя пад'езды. Перамог пад'езд № 13 па вуліцы Кульман, 15. Другое месца — за пад'ездам № 1 на вуліцы К. Маркса, 30 і трэцяе — за пад'ездам № 1 на вуліцы Лідскай, 12.

ШТО МОЖА ДЭПУТАТ?

ФУТБОЛЬНАЕ ПОЛЕ ЗАМЕСТ ПУСТКІ І РУЖЫ НА ГАРАДСКОЙ ПЛОШЧЫ

У людзей складваецца ўражанне аб рабоце дэпутата не па колькасці прынятых рашэнняў, а па іх якасці, упэўнены старшыня Старадарожскага раённага Савета дэпутатаў

Дэпутацкі корпус Старадарожчыны, што на Міншчыне, даказвае ўласным прыкладам: калі ёсць жаданне нешта зрабіць — справа будзе спорыцца! Аб тым, што сёння можа звычайны дэпутат «МС» паразмаўляла са старшынёй райсавета Дзмітрыем ДАВЫДАВЫМ.

Грунтоўны падыход — па вёсцы штогод

«МС»: Дзмітрый Міхайлавіч, зразумела, што галоўная мэта дзейнасці дэпутатаў мясцовага ўзроўню — вырашэнне сацыяльных, эканамічных і культурных праблем на карысць тых, хто жыве ў іх выбарчай акрузе. А давайце канкрэтызуем...

— Вельмі важнае рэчышча дзейнасці — традыцыйныя пытанні жыццезабеспячэння: бытавое, транспартнае забеспячэнне, добраўпарадкаванне, асвятленне вуліц і многае іншае. Акрамя добраўпарадкавання дэпутаты праводзяць інфармацыйна-растлумачальную работу па прафілактыцы злачынстваў, правапарушэнняў, удзельнічаюць у рабоце агядных камісій. Таксама інфармуюць жыхароў па прафілактыцы афрыканскай чумы свіней, пажарнай бяспецы, ідэнтыфікацыі буйной рагатай жывёлы.

Менавіта органам мясцовага самакіравання належыць вызначальная роля ў зборы звестак пры высвятленні патрэбы грамадзян у сацыяльнай падтрымцы, а таксама ў раннім выяўленні сямейных праблем. З удзелам дэпутатаў праводзіцца вызначэнне ўмоў жыцця такой катэгорыі, аказваецца садзейнічанне ў медыцынскім абследаванні, лячэнні і аздараўленні, сацыяльным абслугоўванні, уладкаванні ў дамы-інтэрнаты, выдзяленні сацыяльных ільгот і гарантый, вырашэнні бытавых праблем.

У людзей складваецца ўражанне аб нашай рабоце не па колькасці прынятых рашэнняў, а па іх якасці, па справах, па жывых зацікаўленых зносінах. Таму пераважная большасць сесій райсавета праводзіцца з выездам на месца — на прадпрыемствы, у арганізацыі, у вёскі. Гэта дазваляе ўвачавідкі аціаніць стан спраў і прыняць узважаныя грунтоўныя рашэнні, трымаць сувязь з жыхарамі раёна. Напрыклад, тэмай апошняй нарады стала добраўпарадкаванне вёсак Палажэвіцкага сельсавета. На яго прыкладзе мы праверылі падыход: каб не рассейваць сілы і сродкі, надаць справе планавы характар, у кожным сельсавеце прыводзім у парадак адну вёску за год, прапрацоўваем праблемы яе добраўпарадкавання грунтоўна і надоўга здымаем з парадку дня.

«МС»: На што звяртаеце ўвагу, перш за ўсё?

— Асноўны акцэнт па навядзенні парадку на зямлі робім на знос старых і пустуючых пабудоў, колькасць якіх, на жаль, з кожным годам расце. За апошнія тры гады, напрыклад, было знесена 1017 пабудоў, у тым ліку 305 дамоў. Толькі сёлета знесена 235 такіх аб'ектаў, у тым ліку 64 дамы. Землі акультураны, і перададзены ў севазварот сельгасарганізацый. Сёлета — 85 гектараў. Для нашага невялікага раёна гэта неблагая лічба, але будзем імкнуцца да лепшага.

Наогул жа на сяле за бягучы год пастаўлена 7,7 тысячы метраў новай агароджы, у тым ліку паўтары тысячы — брыгадамі сельвыканкамаў. Высечана каля 45 гектараў расліннасці, прыбрана 173 несанкцыянаваныя звалкі, выдалена 1255 аварыйна небяспечных дрэў.

Скінуліся на агароджу — 25 тысяч рублёў!

«МС»: Хацелася б даведацца аб грамадскіх і дабрачынных ініцыятывах, якія рэалізуюць мясцовыя дэпутаты...

— Мы бачым сваю задачу ў тым, каб аб'ядноўваць суполку старадаражан для добрых і мірных спраў, падтрымліваць у людзях стваральны дух, мацаваць традыцыі малой радзімы. На ўласныя сродкі народных выбраннікаў у перыяд пандэміі мы закупілі неабходныя рэчы для інфекцыйнага аддзялення бальніцы — сотавыя і стацыянарныя тэлефоны, а таксама рэчы медыцынскага ўжытку і запас пітной вады. Гэтак жа ў складчыну мы набылі 65 саджанцаў ружаў, якімі падчас суботніка самі афармілі гарадскую плошчу. Такім жа чынам падаравалі 27 камплектаў пасцельнай бялізны для пацыентаў бальніцы сястрынскага догляду.

Дэпутаты таксама актыўна падтрымлівалі акцыю па народным будаўніцтве храма.

Дзякуючы дэпутату Шчыткавіцкага сельвыканкама Канстанціну Браварэнку ў аграгарадку Шчыткавічы з'явілася новая дзіцячая пляцоўка. А па ініцыятыве дэпутата сельсавета Уладзіміра Бодны на пустцы ў аграгарадку Старыя Дарогі абсталявана поле для спартыўных гульняў.

Мяркую, што вельмі важна заахвоціць людзей і прыцягнуць іх да самастойнага вырашэння некаторых праблем, не чакаючы бясконцай дапамогі ад улады.

«МС»: Але гэтую дзейнасць камусьці трэба арганізаваць, дэпутаты — асобы, якія працуюць на грамадскіх пачатках, у іх асноўная прафесійная дзейнасць забірае шмат часу.

— Вялікая роля тут належыць старастам вёсак. Менавіта дзякуючы ім у нашым раёне набыў размах рух па добраўпарадкаванні і агароджванні вясковых могілак сіламі і сродкамі мясцовых жыхароў. У прыватнасці, жыхары аграгарадка Шчыткавічы сабралі 25 тысяч рублёў і ўстанавілі 720 метраў жалезабетоннай агароджы на могілках.

Дарэчы, аб рабоце на грамадскіх пачатках: гэта яшчэ раз пацвярджае неабходнасць нарматыўна вызначыць статус старасты як прадстаўнікоў мясцовага самакіравання, даць ім магчымасць удзельнічаць у пасяджэннях мясцовых органаў улады, а таксама прадугледзець формы і крыніцы аплаты іх работы.

Наогул, для павышэння ролі органаў мясцовага кіравання пры фарміраванні бюджэтаў мясцовых Саветаў неабходна прадугледзець сродкі для аператыўнага вырашэння пытанняў. Тут ёсць праблема, якая патрабуе вырашэння.

«МС»: А калі не закладваць у бюджэт, а зарабіць самастойна? Тым больш што такі вопыт у краіне ёсць.

— Так, стварэнне камунальных унітарных прадпрыемстваў пры сельсаветах лічу адной з даходных крыніц. Маецца на ўвазе аказанне вяскоўцам платных паслуг па апрацоўцы прысядзібных участкаў, дастаўцы дроў, сена, саломы... Насельніцтва старэе, і такія паслугі карыстаюцца ўсё большым і большым попытам.

Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.
Фота Алега ДАРОШКІ.

Даведка «МС»

Сёння органы мясцовага самакіравання Старадарожчыны прадстаўлены 26 дэпутатамі раённага Савета, 77 дэпутатамі першаснага ўзроўню, а таксама 49 старастамі сельскіх населеных пунктаў. Людзі розных прафесій, узросту і статусу прадстаўляюць практычна ўсе галіны дзейнасці і сацыяльныя слаі насельніцтва.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 24 верасня 2020 года.

ПАНДЭМІЯ ПРАБЛЕМ

Што адбываецца ў Літве?

Днямі ў Літве паведамілі аб рэкорднай колькасці новых выпадкаў каранавіруса. Аднак абвяшчаць лакдаўн нашы суседзі не збіраюцца. Прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа падкрэсліў, што ў дадзены момант было б няправільна спыняць эканоміку. Паводле яго слоў, меры, якія ўжываюцца ў краіне па супрацьстаянні «кавіду», будуць лакальныя пры аператыўнай ідэнтыфікацыі ачагоў, паведамляе газета «Літоўскі кур'ер». Прэзідэнт Літвы падкрэсліў, што немагчыма цалкам спыніць жыццё і закрыць адукацыйны працэс. Да таго ж, па словах Наўседы, незразумела, ці прыносіць поўны лакдаўн вялікі эфект. Як падкрэсліваюць эксперты, пандэмія абнажыла клубок сур'ёзных праблем, якія выспявалі ў эканоміцы, сацыяльнай сферы і дзяржаўным кіраванні Літвы. Што адбываецца ў суседняй краіне?

У ДАЎГАХ

Даходы даволі адчувальна згортваюцца. На фоне крызісу з-за COVID-19 кампаніі скарысталіся магчымасцю адкласці падатковыя плацяжы. У выніку ў студзені — жніўні гэтага года паступленні ў дзяржаўны бюджэт і бюджэты самакіравання Літвы паступіла на 911,6 мільёна еўра (12 працэнтаў) менш, чым планавалася, паведаміла прэс-служба Міністэрства фінансаў. Больш нізкі, чым плануецца, збор быў абумоўлены паказчыкамі рынку працы, на якія негатыўна паўплываў крызіс COVID-19, і павелічэннем запазычанасці з-за адтэрмінаваных плацяжоў па падаходным падатку. Падчас карантыну ў Літве ў другім квартале года каля 33 працэнтаў насельніцтва краіны не працавала або працавала менш гадзін, чым звычайна, перадае baltnews.lt.

Дзяржаўны доўг Літвы да канца гэтага года можа скласці 49,8 працэнта ВУП, а налета ён можа вырасці і дасягнуць 54,5 працэнта. Да такой высновы прыйшоў Дзяржаўны кантроль Літоўскай Рэспублікі ў сваім прагнозе на 2020—2025 гады на фоне эканамічнай нявызначанасці, выкліканай пандэміяй. Пры гэтым, як адзначаецца, паказчык у 54,5 працэнта ВУП паказваецца ў базавым сцэнарыі. Усяго ў справаздачы Дзяржканторолю апісана пяць варыянтаў развіцця сітуацыі. У прыватнасці, адзін са сцэнарыяў прадугледжвае, што дзярждоўг наблізіцца да 60 працэнтаў ВУП. «Мы павінны не толькі стабілізаваць рост дзяржаўнага доўгу, але і прадугледзець яго зніжэнне», — заўважыла дырэктар Дэпартамента па маніторынгу бюджэтнай палітыкі Рута Рукшэнайце. Толькі вось наконт таго, ці атрымаецца рэалізаваць гэта на практыцы, паўстае вялікае пытанне.

КАМУ ПРАДАЦЬ УРАДЖАЙ?

Не менш важнае — «хлебная» праблема. У Літве ў гэтым сезоне добры ўраджай збожжавых, а прадаваць няма каму — з-за пандэміі каранавіруса ўпаў попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю. Па даных Літоўскай асацыяцыі вытворцаў збожжа, ураджайнасць, паводле папярэдніх звестак, на 18 працэнтаў вышэй, чым у мінулым годзе. Агульны каравай ацэньваецца ў 6,5 мільёна тон.

Апошнія некалькі гадоў валавы збор не апраўдваў чаканняў — у 2018-м і 2019-м неўраджай быў выкліканы засухай, а ў 2017 годзе — дажджом. Сёлета лічбы радуюць, але на дабрабыце вяскоўцаў гэта не адбілася. «Ужо мінаюць тэрміны плаціць за збожжа, разлікі ідуць, але мы бачым, што закупкі запаволіліся. Прадпрыемствы, якія гандлююць збожжам, імкнуцца максімальна адкласці заключэнне новых дагавораў, разменкаваць разлікі на працягу больш доўгага перыяду», — заважыў дырэктар асацыяцыі вытворцаў збожжа Ігнас Янкаўскас.

Паводле яго слоў, павольная закупка збожжа выклікае ланцуговую рэакцыю. Без належнага атрымання даходу ад выраблёнай прадукцыі пачынаюць затрымлівацца выплаты саміх фермераў (па падатках, лізінгавых плацяжах). Урад мае намер выплыць сельгасвытворцам 40 мільёнаў еўра ў выглядзе льготных крэдытаў. Аднак, на думку Ігнаса Янкаўскаса, гэта недастатковая сума для вырашэння складанай сітуацыі.

НЯМА ЖАДАННЯ ПРАЦАВАЦЬ

На фоне трывожных навін пра ўсплёск захваральнасці на COVID-19 профільныя ведамствы Літвы паведамілі аб беспрэцэндэнтным росце беспрацоўя. Рэспубліка б'е антырэкорды. Як сведчыць статыстыка, Літва апынулася сярод краін Еўрасаюза з самай вялікай колькасцю беспрацоўных. Гэтая сітуацыя — сур'ёзны выклік для дзяржавы і нацыянальнай эканомікі, аслабленай падчас пандэміі, заўважае baltnews.lt.

Паводле дадзеных Службы занятасці, па стане на пачатак верасня ўзровень беспрацоўя склаў 13,7 працэнта. Такім чынам, 235,6 тысячы чалавек не маюць работы. Рост істотны — яшчэ напрыканцы ліпеня ўзровень беспрацоўя складаў не больш за 9,4 працэнта. Эксперты адзначаюць: і 13,7 % — не мяжа. Прычым сярэдні паказчык — верхавіна айсберга, паколькі ў шэрагу месцаў сітуацыя значна горшая. Так, напрыклад, у правінцыйным мястэчку Кельме ўзровень беспрацоўя падышоў да адзнакі 20 %.

Чаму колькасць прэтэндэнтаў на біржы працы працягвае імкліва расці? Меркаванні экспертаў на гэты конт разышліся, але большасць спецыялістаў вінавацяць улады, прычым сутнасць папрокаў даволі незвычайная — маўляў, яны «закідалі людзей грашыма» і адбілі ў насельніцтва жаданне працаваць.

Міністр сацыяльнай абароны і працы Літвы Лінас Кукурайціс распавёў, што з-за выплат па беспрацоўі ў 200 еўра літоўцы перасталі ўладкоўвацца на нізкааплатныя месцы. «Гэтай уладзе пашанцавала. У іх яшчэ поўныя кішэні грошай. Яны практычна актывуюць беспрацоўе, правакуюць яго, — расказаў дэпутат Еўрапарламента Віктар Успаскіх парталу baltnews. — Новыя працоўныя месцы не ствараюцца. Мінімальны заробак фактычна адпавядае «беспрацоўным» выплатам, таму сацыяльная палітыка перакручаная: яна не матывуе людзей працаваць».

Пры гэтым у суседніх краінах сітуацыя лепшая, чым у Літве. Так, паводле даных мясцовых статыстычных ведамстваў, напрыканцы жніўня ўзровень беспрацоўя ў Латвіі складаў 8,4 %, у Эстоніі — 7,8 %, а ў Польшчы — 6,1 %.

БЕДНЫХ ПАБОЛЬШАЕ

Узровень беднасці ў Літве ў 2020 годзе можа павысіцца, асабліва сітуацыя пагоршыцца ў катэгорыі людзей пенсіённага ўзросту, лічаць у Дэпартаменце статыстыкі рэспублікі. Ва ўзроставай групе старэйшых за 65 гадоў адпаведны паказчык сёлета складзе каля 40 працэнтаў (афіцыйная лічба летась — 31,6 %).

Каранцін з-за каранавіруса зробіць маламаёмных літоўцаў жабракамі, а дапамога ЕС да іх не дойдзе. Аб гэтым заявіла ў перадачы «Дзень на Delfi» дырэктар Нацыянальнай сеткі асацыяцый па скарачэнні беднасці Айстэ Адомавічэне. Паводле яе слоў, нават пасля выхаду з каранціну многія сутыкаюцца з сур'ёзнымі фінансавымі цяжкасцямі, таму людзі выказваюць вялікую незадаволенасць ростам цэн і тэмпамі аднаўлення эканомікі.

«Ёсць такая галіна, як авіяцыя, якая цалкам закрылася, і сцюардэсы страцілі свае рабочыя месцы. Гэта ў тым ліку жанчыны ва ўзросце каля 50 гадоў, якія ніколі не працавалі на якой-небудзь іншай рабоце і павінны думаць пра тое, дзе працаваць на працягу некалькіх гадоў да выхаду на пенсію. Зараз яны часова жывуць на дапамогі», — расказала Адамавічэне. Яна адзначыла, што падобныя гісторыі нярэдкія. Пры гэтым ёсць і людзі, якія атрымліваюць вельмі нізкі даход — сярэдняя сацпадтрымка складае ўсяго 85 еўра.

Паводле слоў старшага эканаміста банка Luminor Жыгімонтаса Маўрыцаса, вялікі выклік чакае і прадстаўнікоў сярэдняга класа: «Гэта нават можа выліцца ў незадаволенасць і ў хвалю эміграцыі». Масавы ад'езд магчымы, аднак усё будзе залежаць ад эканамічнай сітуацыі ў краіне, лічыць эксперт. «Калі казаць пра тое, што будзе ў наступным годзе, то такая рызыка ёсць, асабліва гэта датычыцца работнікаў пацярпелых сектараў, а таксама моладзі, бо падчас пандэміі працу знайсці складаней», — цытуе Delfi Маўрыцаса.

Раней эксперты падзяліліся меркаваннем аб магчымым масавым адтоку літоўскіх грамадзян. Так, прафесар Каўнаскага тэхналагічнага ўніверсітэта Вільматне Кумпікайтэ-Валюнене адзначыла, што эміграцыя разгорнецца не адразу. «На самай справе хваля пачнецца. Я думаю, восенню, у пачатку 2021-га, калі людзі не змогуць знайсці работу і ўбачаць, што інакш выжыць не атрымаецца», — заявіла яна. Па словах Кумпікайтэ-Валюнене, пакуль рана прагназаваць, колькі літоўскіх грамадзян збіраецца эміграваць, аднак ёсць верагоднасць, што лічбы будуць падобныя да тых, што былі ў 2010 годзе, калі з'ехалі амаль 100 тысяч жыхароў Літвы. Усё будзе залежаць «ад узроўню беспрацоўя, але крывая будзе падобная. На меры росту колькасці беспрацоўных будзе расці эміграцыя», — заўважыла прафесар.

ВАКЦЫНА І ТЭСТЫ

Барацьба з каранавірусам «падсвятліла» праблемы ў дзяржкіраванні. Ва ўладных кабінетах працягваецца дыскусія аб закупцы вакцыны ад каранавіруса. Прэм'ер-міністр Літвы Саўлюс Скверняліс заклікаў прэзідэнта рэспублікі Гітанаса Наўседу разгледзець гэта актуальнае пытанне на ўзроўні Дзяржсавета па абароне. Сваю прапанову кіраўнік урада абгрунтаваў тым, што набыццё вакцыны сумесна з іншымі краінамі з'яўляецца пытаннем дзяржаўнай важнасці. Паводле яго слоў, фармкампанія AstraZeneca, якая займаецца распрацоўкай вакцыны, падазраецца ў хабарніцтве і распаўсюджванні неэфектыўных лекаў.

Аднак у адміністрацыі прэзідэнта лічаць, што падобным пытаннем павінны займацца ў Міністэрстве аховы здароўя на чале з прэм'ерам, а разгляд тэмы вакцыны ў Дзяржсавеце па абароне з'яўляецца спробай перакласці сваю адказнасць на іншы дзяржорган.

«Гэта проста лухта — гэта не кампетэнцыя міністра, нават не кампетэнцыя ўрада. Гэта закранае стратэгічныя пытанні, калі мы менш важныя пытанні абмяркоўваем у такім фармаце — нейкія чыгункі, рэйкі і да таго падобнага. А дадзеная праблема звязаная не толькі з пытаннем жыцця і здароўя нашых жыхароў на шмат гадоў наперад, але і з эканомікай, гаспадаркай. Бо гэта не проста крызіс у сферы аховы здароўя, ён закранае ўсе сегменты жыцця грамадства: ад эканомікі да аховы здароўя», — адказаў Скверняліс.

У абарону прэм'ера выступіў міністр аховы здароўя Аўрэліус Вярыга. «Ніхто не спрабуе пазбегнуць адказнасці, фінансавыя і іншыя пытанні будзе вырашаць сам урад. І я думаю, што вышэйшыя кіраўнікі краіны абавязаны ўсведамляць гэту сітуацыю, абавязаны ведаць кантэкст і разумець, што адбываецца, чаму адбываецца, у сувязі з чым прымаюцца тыя ці іншыя рашэнні», — заўважыў Вярыга.

Раней у Літве разгарэўся скандал з закупкай экспрэс-тэстаў. Пасля ўвядзення каранціну ў сакавіку было вырашана набыць каля 510 тысяч экспрэс-тэстаў на каранавірус у кампаніі Profarma на суму звыш шасці мільёнаў еўра. Аднак высветлілася, што не ўсе выдаткаваныя сродкі паступілі аўстрыйскаму вытворцу Ameda Labordiagnostik, які адказваў за пастаўку экспрэс-тэстаў. У кампанію было пераведзена толькі 1,5 млн еўра.

Больш за тое, пазней высветлілася, што тэсты былі набытыя не па рынкавай цане. Урад заплаціў 12 еўра за штуку, у той час як іншы літоўскі прадавец экспрэс-тэстаў — Pro Aris — прапанаваў прадаць іх менш чым за 4 еўра. У выніку сродкі былі выдаткаваныя, а большую частку экспрэс-тэстаў так і не выкарысталі. Да канца ліпеня было праведзена ўсяго каля 20 тысяч экспертыз. Скандал у Міністэрстве аховы здароўя прывёў да абвінавачвання ў адрас кіраўніка ведамства Аўрэліуса Вярыгі і адстаўкі яго намесніка Ліны Ярушавічэне.

ПРЫЧЫНА КРЫЗІСУ

Крызіс у Літве мае сістэмны характар і стаў відавочны ва ўмовах пандэміі каранавіруса, лічыць экс-міністр замежных спраў рэспублікі Павілас Гіліс. «Мы жывём ва ўмовах палітычнага, прававога, маральнага і эканамічнага крызісу, і, магчыма, галоўнай яго прычынай з'яўляецца ідыятызм нашай «эліты». Мабыць, невыпадкова, што ў апошні час у нашай публічнай прасторы пачасціліся размовы пра яго», — заявіў Гіліс парталу Pozicija.

Паводле яго слоў, пандэмія, як і вайна, уяўляе вялікую пагрозу для нацыянальнай бяспекі Літвы, а дзяржава з усімі сваімі інстытутамі павінна рэагаваць на гэтыя пагрозы, вызначаючы меры ў адказ. Прычым у самым пачатку, калі пагроза віруса толькі абазначылася, літоўскія дзяржустановы спазніліся і не распазналі яе належным чынам, адзначыў Гіліс.

Ён асудзіў дзеянні літоўскага ўрада і іх рашэнні, звязаныя з рэагаваннем на пагрозы пандэміі. «Прыкмет стратэгічнага мыслення на макраўзроўні пакуль не назіраецца», — падкрэсліў экс-кіраўнік МЗС Літвы. На яго думку, калі літоўскія ўлады не «адрэагуюць на сітуацыю», то «крызіс у эканоміцы будзе працягвацца і паглыбляцца».

Няўжо ў такой сітуацыі варта беспардонна ўмешвацца ў справы суседняй дзяржавы? Адказ — відавочны. Ён шмат у чым вынікае з эмацыянальнай прамовы экс-міністра замежных спраў, згаданай вышэй.

Пётр ДУНЬКО.

• **Даслоўна**

Уладзімір МАКЕЙ:

«Кіраўніцтва літоўскага МЗС вылазіць са скуры, каб больш за ўсіх выліць бруду на Беларусь»

Пра гэта міністр замежных спраў Беларусі заявіў падчас запісу свайго выступлення да агульнай дыскусіі 75-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН, паведаміла БелТА.

«Здзіўляюся некаторым заявам майго калегі (гаворка пра кіраўніка МЗС Літвы. — **БелТА**). У нас быў нябожчык намеснік міністра замежных спраў Пётр Бяляеў, які казаў: «Яшчэ асноўныя гульцы на сцэну не выйшлі, а малец ужо чачотку б'е». Мой калега, хай ён мне даруе, нагадвае мне мальца, які цяпер са скуры вылазіць, каб больш за ўсіх выліць бруду на Беларусь. Мы разумеем, чаму гэта адбываецца, хутка ў іх парламенцкія выбары. Таму там навыперадкі ўсе бягуць у плане таго, каб ускубнуць больш балюча Беларусь. Перажывём і гэта», — сказаў міністр.

Паводле яго слоў, літоўскае МЗС неадэкватна ацэньвае сітуацыю і робіць адпаведныя заявы. «Калі яны думаюць, што тым самым умацоўваюць суверэнітэт і незалежнасць Беларусі, то глыбока памыляюцца. Вядома ж, гісторыя расставіць усё на свае месцы. Ведаю, што гэта не спадабаецца, будзе крытыка з яго боку, але я кажу гэта абсалютна свядома, таму што мы шмат разоў гаварылі на гэту тэму — і адзін на адзін, і ў пашыраных складах. Хацелася б, каб усё ж такі маё калегі спыніліся, задумаліся і паспрабавалі аб'ектыўна, разумна ацаніць сітуацыю і не даводзіць яе да той мяжы, калі ўжо вярнуцца назад будзе немагчыма», — падсумаваў Уладзімір Макей.

Люстэрка лёсу

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

З кнігі «МОЙ ФІЗМАТ»

(Працяг. Пачатак у нумарах ад 22—24 верасня)

Леанід Аляксандравіч ЛАТОЦІН

У час маёй вучобы на фізмаце пра Латоціна хадзілі легенды. Я пра гэта даведаўся, калі нас са старэйшым братам пасялілі ў інтэрнат № 1 па вуліцы Ленінскай. І там нам адразу расказалі, што на другім паверсе жыве ўсім вядомы студэнт чацвёртага курса Лёня Латоцін. Ён не толькі сам прытрымліваўся строгіх правіл паводзін, але стараўся «павярнуць да сваёй веры» і студэнтаў з ліку хлопцаў, якія часта выпівалі, былі заўважаны ў дробным хуліганстве ці проста былі добрымі шалапутамі. Лёня выбіраў аднаго з такіх студэнтаў і абвяшчаў над ім шэфства: карміў яго, сачыў за наведваннем заняткаў, знешнім выглядам, вызначаў яго вольны час і кантраляваў, чым той займаецца. Гэтых студэнтаў усе называлі «сынкамі» Латоціна.

Лёня ад прыроды быў гіпердынамічным. Яго хапала не толькі на вучобу, а яшчэ яму патрэбен быў поўнамаштабны занятак. І калі ён яго знаходзіў, то не толькі сам пагружаўся ў новае захапленне, але і пад ціскам уцягваў туды ўсіх астатніх. Мы з ім былі заўсёды побач, сябравалі і практычна кожны дзень кантактавалі, ажно да самага майго прызначэння міністрам адукацыі. Але і ў Мінску, няхай і апасродкавана, ён працягваў мяне «даймаць» сваімі ідэямі.

Пасля эпапеі выхавання «сынкоў» Латоцін захапіўся вывучэннем універсальнай мовы эсперанта. Сам яе засвоіў дасканальна, а мы з цяжкасцю адбіліся ад яго настойлівых спроб і нас уцягнуць у гэту чарговую «веру».

На нейкі час ад падобных зацікаўленняў Лёню адцягнула аспірантура, падрыхтоўка да абароны кандыдацкай дысертацыі. Але ненадоўга. Прыйшоў 1985-ы і вядомая ўсім гарбачоўская кампанія барацьбы з п'янствам. Лёня глыбока і дасканала вывучыў пагубныя наступствы захаплення спіртным і далейшага алкагалізму, падрыхтаваў курс лекцый на гэту тэму і запісаўся ў першыя рады прапагандыстаў здаровага ладу жыцця. Наш з Лёнем сябар, таксама аспірант прафесара А. А. Столяра, Валодзя Дрозд, калі даведаўся пра актыўнасць Латоціна на антыалкагольным фронце, пацікавіўся, у якіх аўдыторыях Лёня выступае з гэтымі лекцыямі? Валодзя жыў у Мінску і ўсіх падрабязнасцяў не ведаў.

Адказваю:

— На лентаткацкай фабрыцы, на камбінаце шаўковай тканіны, ва ўнівермагу, у буйных гастранамах, у школах, сярод нашых студэнтаў.

Валодзя ўдакладняе:

— Я так зразумеў, што ў асноўным у жаночых калектывах?

Пацвярджаю:

— Так, там яго не проста слухаюць, а з усім пагаджаюцца!

Тады Дрозд і кажа:

— Ты яму скажы, каб паспрабаваў са сваімі антыалкагольнымі тэзісамі выступіць перад кіламетровай чаргой у гарэлачную краму!

З часам захапленне барацьбой з п'янствам у Латоціна таксама прайшло. Тым болей, што да гэтага часу ён ажаніўся. І тут да яго з новай стыхіяй вярнуўся вопыт клопату пра «сынкоў», але цяпер ужо з прымяненнем ранейшых навыкаў у сям'і. Мы, маладыя выкладчыкі, у той час жылі сваімі сем'ямі ў студэнцкім інтэрнаце. Усё было агульнае: кухня, прыбіральні, умывальнікі. Усё на вачах. І ўсе заўважылі, што сваёй маладой жонцы Людміле Лёня ўвогуле нічога не дазваляе рабіць з хатніх заняткаў. Ён сам гатуе ежу, прыбіраецца ў пакоі, ходзіць па крамах, мые посуд, бялізну. Жонкі іншых выкладчыкаў, назіраючы такія турботы аб сваёй палавіне, сталі папракаць уласных мужыкоў — чаму яны ўвесь побыт пераклалі на іх плечы? Пачаліся сямейныя скандалы, і калегі Латоціна нават забралісе яго пабіць, іншым метадам пераканання ён не паддаваўся.

Я думаю, што клопат пра блізкіх — у Лёні ад нараджэння. Ён заўсёды быў і будзе з ім. Вось яшчэ адзін доказ у тэму. У 1991 годзе ўтрох, Л. А. Латоцін — тады ўжо загадчык кафедры выкладання матэматыкі, М. П. Марозаў — загадчык кафедры матэматычнага аналізу, і я — загадчык кафедры алгебры і геаметрыі, удзельнічалі ў канферэнцыі матэматыкаў Беларусі. Яна тым разам праходзіла ў Гродне, і Леанід Аляксандравіч сам вызваўся быць арганізатарам нашай паездкі. Вырашылі, што едзем на канферэнцыю аўтобусам, па дарозе туды і назад абедаем у Мінску ў пельменнай каля вакзала. Жывём утрох у адным нумары гасцініцы. Бяром з сабой набор прадуктаў па прадыктаваным ім спісе (а раптам з харчаваннем будуць праблемы). Паездка сапраўды была прыкметная — праз усю Беларусь, з цікавымі дарожнымі размовамі, у прыўзнятым настроі. Усе побытавыя клопаты Латоцін узяў на сябе: ён нас будзіў раніцою (пры гэтым вельмі рана і безапеляцыйна), рыхтаваў сняданак, наводзіў парадак у нумары, вызначаў, дзе будзем абедаць і вячэраць. Гэта ўсё ў яго адбывалася зусім натуральна, як быццам так яно і павінна быць, а не іначай. Нас з Мікалаем толькі здзіўляла яго надзвычайнае жаданне кожны дзень глядзець модны тады серыял «Рабыня Ізаўра». Перад пачаткам гэтага фільма Латоцін кідаў усе справы і садзіўся каля тэлевізара. Адцягнуць яго ўвагу ад прагляду было немагчыма. Дарэчы, мяне тады моцна здзіўляла нечаканая захопленасць гэтым «мыльным» серыялам некаторых блізкіх мне, разумных і таленавітых людзей. Напрыклад, майго малодшага брата Міхаіла, цяпер заслужанага ўрача Беларусі, ці Валерыя Барашкава, зараз народнага настаўніка.

Канферэнцыя ў Гродне была цікавая, на яе прыехала шмат нашых сяброў, і час праляцеў незаўважна. І вось ужо надышоў момант завяршэння камандзіроўкі — на наступную раніцу трэба было ад'язджаць. Мы таксама выступалі з дакладамі на канферэнцыі, удзельнічалі ў дыскусіях, і за тры дні такой інтэнсіўнай навуковай працы прыкметна стаміліся. З Колем вырашылі вечарам у нумары гасцініцы па-сяброўску пасядзець за чаркай. Вельмі ўжо хацелася свабодна абмеркаваць атрыманыя ўражанні. Захопленыя гэтай ідэяй, мы з Марозавым, ідучы па вуліцах Гродна, пачалі абмяркоўваць, якое спіртное і колькі нам яго ўзяць на вячэру. Нашу размову пачуў Латоцін. Ён ужо ў тыя гады кантактаваў з усімі толькі на беларускай мове і нам заявіў:

— Я катэгарычна супраць!

— Чаму? — запыталіся мы.

— У мяне галава баліць!

— Тады не прымай удзел! Мы будзем выпіваць без цябе!

— Я ўсё адно супраць! — гаворыць Латоцін. — Я ж не ўстрымаюся!

...Беларуская мова стала чарговым глыбокім захапленнем Леаніда Аляксандравіча. Ён перайшоў на яе адразу і паўсюль: на лекцыях, у размовах з калегамі і сябрамі, у крамах, у грамадскім транспарце, у сям'і. Мала таго, ён стаў настойліва патрабаваць поўнага пераходу на беларускую мову ў працы і ў стасунках усіх, хто яго акружаў. Пасля маіх спроб некалькі разоў суцішыць яго запал у гэтых адносінах ён аднойчы ў спрэчцы са мною сказаў:

— Ты, Радзькоў, беларус, аднак ты рускі беларус!

Што ён пры гэтым меў на ўвазе, я і цяпер не зусім разумею.

Яшчэ болей здзівіў мяне з Латоціным прафесар А. А. Столяр. Ён да Лёні добра ставіўся, давяраў яму ва ўсім, разгледзеўшы яго не паказушную руплівасць у вучобе. Абрам Аронавіч праз Латоціна часам прасіў нас дапамагчы яму ў некаторых побытавых пытаннях. Напрыклад, Лёня па просьбе Столяра арганізаваў брыгаду студэнтаў для дапамогі ў пераездзе на новую кватэру. Працавалі мы ўвесь дзень, перавозілі мэблю, розныя рэчы, кнігі. Убачыўшы, што да канца дня мы прытаміліся, жонка Столяра Клаўдзія Аляксееўна прыгатавала нам вячэру: адварыла бульбы, насмажыла мяса, нарэзала гародніны. Абрам Аронавіч адкаркаваў нават бутэльку чырвонага віна. У яго ўжо былі шырокія навуковыя сувязі, і да яго ў Магілёў часта прыязджалі вучоныя з Сярэдняй Азіі, з Каўказа. Віно было з Грузіі, але калі Столяр яго даставаў, ён паказаў нам кавалачкі вяленай дыні. Толькі паказаў! У тыя часіны мы нават свежую дыню рэдка бачылі, а тут яна вяленая. Але ж няёмка прасіць у Столяра паспытаць такі дэлікатэс. Аднак пасля выпітага фужэра віна Латоцін пасмялеў, хоць ён і так заўсёды быў ва ўсім прамалінейны, і звярнуўся да Столяра:

— Абрам Аронавіч, вы нам паказвалі вяленую дыню. Відаць, забыліся паставіць яе на стол?

Столяру нічога не заставалася, як пачаставаць нас гэтай смакатой. Смак вяленай дыні памятаю да гэтага часу. А калі б не Латоцін?..

(Заканчэнне будзе.)

Пераклаў з рускай мовы Максім ВЕЯНІС.

Далучайцеся!

ЧЫТАЕМ ЛЮБІМЫЯ ВЕРШЫ

Нацыянальная бібліятэка Беларусі з 1 да 15 лістапада запрашае ўсіх прыхільнікаў паэзіі да ўдзелу ў анлайн-конкурсе чытальнікаў «О Беларусь, мая шыпшына», прымеркаванага да 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі ў межах праекта «На хвалі часу, на плыні жыцця».

Уладзімір Дубоўка ўзбагаціў беларускую літаратуру яркімі паэтычнымі творамі. Яго бліскучы талент стварыў новы, кранальны і ўзвышаны вобраз Беларусі часу бурлівых грамадскіх перамен. Кожны, хто жадае спрычыніцца да святкавання 120-годдзя пісьменніка, можа прыняць удзел у конкурсе, абвешчаным галоўнай бібліятэкай краіны. Трэба толькі ўважліва азнаёміцца з умовамі творчага спаборніцтва і прадставіць на суд журы сваё прачытанне верша ці паэмы Уладзіміра Дубоўкі.

Відэазапіс са сваім выкананнем твора пісьменніка (у ім абавязкова пазначце сваё імя і назву твора) дасылайце на электронную пошту konkurs.dubowka120@gmail.com. Таксама ў лісце трэба крыху расказаць аб сабе: назваць свой узрост, месца пражывання, працы/вучобы, пакінуць кантактны нумар тэлефона.

Што датычыцца крытэрыяў ацэнкі відэа, то тут асноўная ўвага будзе звяртацца на выразнасць чытання і артыстычнасць выканання мастацкага твора. Важна адзначыць, што, дасылаючы сваё відэа на конкурс, гэтым удзельнікі дазваляюць выкарыстоўваць сваю працу на партале бібліятэкі і ў сацыяльных сетках (з абавязковым пазначэннем аўтарства). Пераможцы будуць аб'яўлены 19 лістапада 2020 года. З вынікамі конкурсу можна будзе азнаёміцца на партале www.nlb.by і ў сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама на старонках і сацыяльных сетках часопісаў «Маладосць» і «Бярозка».

Алена ДРАПКО.

Ведай нашых!

Геаграфія + англійская мова

Беларускія школьнікі сталі прызёрамі Еўрапейскай геаграфічнай алімпіяды (EGEO-2020). У гэтых спаборніцтвах яны ўдзельнічалі ўпершыню.

Залаты медаль заваяваў дзесяцікласнік брэсцкай гімназіі № 1 Дзяніс Рабчук, таксама ён стаў абсалютным пераможцам дадатковага картаграфічнага конкурсу «HERE GEO challenge». Адзінаццацікласнік сталічнай гімназіі № 33 Дзмітрый Шпартаў узнагароджаны бронзавым медалём. Кіраўнікамі нацыянальнай зборнай выступілі дацэнт кафедры міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін Людміла Факеева і дэкан факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ Дзмітрый Курловіч.

У гэтым годзе Еўрапейская алімпіяда па геаграфіі праходзіла ў дыстанцыйным фармаце. Рабочая мова спаборніцтваў — англійская. Алімпіяда ўключала тры туры: тэарэтычны, практычны і мультымедыйны. Удзельнікі выконвалі заданні і тэсты па асноўных раздзелах геаграфіі, а таксама аналізавалі касмічныя здымкі і карты тэрыторый.

Усяго ў алімпіядзе прыняло ўдзел больш за 70 школьнікаў з 14 краін: Беларусі, Расіі, Азербайджана, Літвы, Эстоніі, Турцыі, Сербіі, Славеніі, Казахстана, Чэхіі, Балгарыі, Бельгіі, Босніі і Герцагавіны, Малдовы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже лота № 1:
право заключения договора аренды имущества:

1. Сооружение «Охраняемая стоянка автомобилей (площадка)» (инв. № 4381), входящее в состав капитального строения «Автомобильная стоянка» с инв. № 600/С-136, 1933 кв. м. **2. Сооружение «Ограждение открытой охраняемой стоянки» (инв. № 4385),** входящее в состав капитального строения «Автомобильная стоянка» с инв. № 600/С-136, 153 м. **3. Сооружение «Тротуары» (инв. № 4386),** входящее в состав капитального строения «Автомобильная стоянка» с инв. № 600/С-136, 415 кв. м. **4. Здание «Контрольно-пропускного пункта при АЗС-75» (инв. № 4376),** входящее в состав капитального строения «Автомобильная стоянка» с инв. № 600/С-136, 38,8 кв. м. **5. Оборудование «Многофункциональный счетчик ЕМП» (инв. № 4389),** 1 ед. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 51 км МКАД.

Начальная цена с НДС – 2 016,85 руб. **Задаток** – 201,68 руб.
Срок договора аренды – 3 (три) года.
Продавец: РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт».
Размер ежемесячной арендной платы: - за сооружение «Охраняемая стоянка автомобилей (площадка)» – 200 базовых арендных величин (в том числе НДС 20 %) в месяц; - за сооружение «Ограждение открытой охраняемой стоянки» – 20 базовых арендных величин (в том числе НДС 20 %) в месяц; - за сооружение «Тротуары» – 15 базовых арендных величин (в том числе НДС 20 %) в месяц; - за здание «Контрольно-пропускного пункта при АЗС-75» – 87,53 рубля (в том числе НДС 20 %) в месяц; - за оборудование «Многофункциональный счетчик ЕМП» – 8,22 рубля (в том числе НДС 20 %) в месяц.

Капитальное строение «Автомобильная стоянка» с инв. № 600/С-136 находится на земельном участке с кадастровым № 623680600001000408.

Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания существующей автомобильной стоянки с контрольно-пропускным пунктом. Право постоянного пользования.

Аукцион состоится **26.10.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Іканастас для святога

Выхаванцы Веснаўскага дома-інтэрната, што на Магілёўшчыне, робяць сваімі рукамі абразы для пабудаванай на іх тэрыторыі капліцы

Культавая пабудова, якая будзе асвечана на свята Пакроваў у гонар святіцеля Патрыка, асветніка зямлі Ірландскай, ужо цалкам гатова, засталося толькі упрыгожыць храмавыя сцены іконамі. Ва ўстанове для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця прывыклі ўсё па магчымасці рабіць самастойна. Таму і іконы для храма вырашылі ствараць сваімі рукамі. Сёння пры ўстанове дзейнічае цэлая майстэрня, дзе робяцца ўпрыгажэнні для маленькай царквы.

Вольга КУНЦЭВІЧ за работай.

Каб любіць, трэба верыць

Выхаванцы дома-інтэрната наогул людзі творчыя. У сваіх майстэрнях яны ствараюць неверагодныя рэчы. Таму, калі размова зайшла пра напаўненне капліцы царкоўнымі атрыбутамі, нават сумненняў не было, што ўстанова справіцца сваімі сіламі.

— Нашы падапечныя яшчэ да таго, як мы пабудавалі дом для малітвы, вышывалі іконы, — кажа **дырэктар Веснаўскага дома-інтэрната Вячаслаў КЛІМОВІЧ.** — Асабліва прыгожа атрымліваюцца яны ў Вячаслава Браўсава. Яго абразы раз'ехаліся ўжо па ўсім свеце. Іх з задавальненнем бяруць нават за мяжу.

Вячаслаў, дарэчы, займаецца гэтым болей дзесяці гадоў. Кажа, што калі ён вышывае іконы, у яго ўзнімаецца настрой. Першы абраз ён прысвяціў Мікалаю Цудатворцу, а потым вышываў і Ісуса, і Божую Маці... Схемы, ніткі, канву — усё купляе сабе сам або прымае ў падарунак ад знаёмых. Прызнаецца, што аднойчы папрасіў Госпада, каб ён дапамог яму сустрэцца з братам. І цуд адбыўся, брат прыехаў да яго.

— Вера вельмі дапамагае чалавеку ў жыцці — да гэтага асэнсавання кожны з нас аднойчы прыходзіць, — кажа Вячаслаў Клімовіч. — Калі над намі ўзялі шэфства ірландцы, мы шмат чаму ў іх навучыліся. Яны з вялікім хваляваннем адносяцца да веры, любяць бліжняга такім, які ён ёсць. Гэта вельмі складана, але неабходна. Мы яшчэ не ведаем, што нас саміх чакае ў гэтым жыцці.

Летась епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім блаславіў будаўніцтва храма на тэрыторыі Веснаўскага дома-інтэрната. Усё неабходнае стваралася ў тутэйшай сталярнай майстэрні. Пад кіраўніцтвам інструктара па працоўным навучанні Рамана Шпілеўскага выхаванцы рабілі драўляныя дэталі для капліцы, а непасрэдна будаўніцтвам займаўся рабочы па абслугоўванні будынкаў і збудаванняў Дзмітрый Шамятун.

У стылі старадаўняй тэхнікі

Валанцёры падарылі дому-інтэрнату наборы алмазнай мазаікі, і тут вельмі хутка асвоілі новы від майстэрства. Сёння гэты кірунак наогул адзін з папулярных сярод аматараў хэнд-мэйду. Тут не патрэбны ні іголкі, ні ніткі, ні пяльцы — пластыкавыя каменьчыкі прымацоўваюцца да схемы, надрукаванай на паперы. Сваім агранаваннем яны ствараюць зіхаценне, таму і тэхніка называецца алмазнай. Працэс стварэння такіх ікон нагадвае старажытную тэхніку мазаікі. Гатовы выраб можна лічыць сапраўдным творам мастацтва. Для здаровага чалавека нічога складанага ў гэтай тэхніцы няма, хутчэй наадварот. Але для людзей, якія тут жывуць, такая работа — своеасаблівы подзвіг.

Галоўным захапленнем Аляксандра Галдаева з'яўляецца маляванне, хоць ён ад нараджэння не мае ні далоняў, ні ступняў. Ён навучыўся маляваць, зацісnуўшы пэндзаль у зубах, і робіць гэта віртуозна. А яшчэ ён шмат часу праводзіць у інтэрнэце і вельмі спрытна карыстацца стылусам. Аналагічным чынам ён збірае і алмазную мазаіку.

Аляксандр ГАЛДАЕЎ стварае нерукатворныя абразы.

Складаней працаваць з ёй Насці Сіваковай, у якой ДЦП і сур'ёзныя праблемы з каардынацыяй рук. Да таго як асвоіла алмазны «жывапіс», яна збірала звычайную мазаіку, рабіла аплікацыі. Алмазная тэхніка патрабуе вялікай дакладнасці ў рухах, і Насця прыкладае шмат намаганняў, каб гэтыя дробныя дэталі траплялі ў патрэбнае месца. У яе гэта звычайна атрымліваецца з другой або трэцяй спробы. Але яна дзяўчына ўпартая.

— Магу сабраць ікону за тыдзень, а магу за два, — кажа Насця. — Усё залежыць ад складанасці работы і настрою. Ужо зрабіла дзве іконы і некалькі карцін.

— Насця наогул малайчына, — радуецца за сваю падапечную **выхавальніца Ірына ГРЫШЫНА.** — Ёй гэтыя карціны даюцца з вялікай цяжкасцю, таму і больш каштоўныя. Наогул для нашых выхаванцаў гэты занятак вельмі карысны.

У Вольгі Рагайн з матарыкай рук усё добра, яна працуе лёгка і з натхненнем. Любімаму занятку часта прысвячае і свой вольны час. На працатэрапію ў доме-інтэрнаце выдзяляецца максімум чатыры гадзіны, але тым, каму падабаецца гэтым займацца, дазваляюць браць работу на дом.

— На жаль, яны не зусім усведамляюць, хто такія святыя, але інтуітыўна адчуваюць гэтую энергетыку, — кажа вызавальніца. — Вельмі радуюцца, калі прыязджае свяшчэннік і хваліць іх работу.

— На нашых іконах Божанька і Божая Маці, — тлумачаць блізняткі Вольга і Віка Кунцэвіч. І згадваюць, што некалькі разоў былі ў храме і зараз чакаюць, калі адкрыецца іх капліца.

Гэтага моманту наогул тут чакаюць усе — і выхаванцы, і выхавальнікі. Псіхолаг дома-інтэрната Ірына Саўчук расказвае, што калі ўстанаўлівалі купал і крыж, шмат хто прыйшоў паназіраць за гэтай падзеяй.

— Таму і іконы нашы выхаванцы робяць з вялікім натхненнем, радуюцца, калі бачаць вынік сваёй работы, — кажа псіхолаг. — Вельмі чакаюць таго моманту, калі нарэшце зробленыя імі абразы ўстановяць у капліцы. У нас своеасаблівая ўстанова, тут зусім іншае ўспрыманне рэчаіснасці. Захапленне алмазнай мазаікай дапамагае пазбавіцца ад надакучлівых думак, змагацца са стрэсам, развівае дробную маторыку, што ў сваю чаргу паляпшае работу мозга. Асаблівасць выкладвання абразоў у тым, што гэта ўзмацняе сувязь чалавека з Богам. Можна сказаць, што падчас работы адбываецца маральнае ачышчэнне, развіваюцца найлепшыя якасці асобы — працавітасць, упартасць.

— У нашых выхаванцаў залатыя рукі, яны ўкладваюць у свае вырабы ўсю душу, — дадае дырэктар. — І знаходзяць вялікія сілы, каб выпрацаваць у сабе ўседлівасць і цярпенне. А гэта складана не толькі для іх, але і для кожнага з нас.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Веснаўскага дома-інтэрната.

Неасабісты суб'ектыў

НА СОНЕЧНЫМ БАКУ СЕЦІВА,

або Анчоусы з цюлькі і чырвоныя макі ў сіняй вазе

ПАМЯТАЕЦЕ гэту фразу з Булгакава, якую пісьменнік уклаў у вусны прафесара Праабражэнскага: «Не чытайце з раніцы савецкія газеты»? Калі выкласці яе на сучасны капыл з мэтай захаваць сэнс таго, што мелі на ўвазе аўтар і яго герой (не чытайце, бо сапсуяце сабе настрой і самаадчуванне на ўвесь дзень), то гучаць будзе прыблізна так: «Не чытайце з раніцы сацыяльныя сеткі і тэлеграм-каналы». І паўтараеш сабе гэта кожны дзень, а толькі ўладкуешся ў тралейбусе — рука сама цягнецца да смартфона. Гэткі, можна сказаць, самазнішчальны абрад, бо ні самаадчуванне, ні настрой лепшым ад яго дакладна не становіцца.

Прынамсі, так я думала да нядаўняга часу. Пакуль не злавіла сябе на тым, што шукаю ў названых віртуальных прасторах толькі тое, што датычыцца палітычных падзей і таго, што вакол іх адбываецца. Прааналізавала, выдыхнула — і вырашыла паглядзець на рэчы больш аб'ектыўна: у «Фэйсбуку» звярнуць увагу не толькі на тое, што сетка падае мне як свежыя навіны, але і не паленавацца зайсці на старонкі сяброў. Іх у мяне там зусім няшмат — усяго 130 чалавек, але затое ўсіх ведаю асабіста.

УРАЖАННІ, скажу я вам, надзвычай цікавыя. Бы ішла па ценявым баку вуліцы, дзе і халаднавата, і цемнавата, а потым раптам дадумалася перайсці дарогу і трапіла туды, дзе свеціць сонца. Яно, канешне, таксама за аблокі хаваецца, і сівер, бывае, падзьме, але ж не ўсё вакол змрок ды холад, як дагэтуль думалася.

Вядома, ад таго, што адбываецца навокал, мае «фрэнды» не адгароджваюцца. Хтосьці з іх хваліцца сваімі свежымі фота з акцыі «За Беларусь!», хтосьці кожную нядзелю выходзіць «на пратэст», а пасля з гонарам (ці з самаіроніяй) піша, як, кіруючыся маршрутам тэлеграм-канала, «нахадзіў» 25 тысяч крокаў. Хтосьці посціць песню «Любімую не аддаюць», хтосьці — навіны апазіцыйных сайтаў. Але гэтыя публікацыі нельга назваць галоўнымі ці дамінуючымі. Ёсць іншыя — больш асабістыя і ад гэтага больш цікавыя. Звычайнае жыццё звычайных людзей. Сонечны бок сецівa, на які многія з нас апошнім часам зусім не заглядваюць.

ВОСЬ, напрыклад, спадарыня Тамара. Ходзіць на прэм'еры ў Вялікі і на лекцыі па фотамастацтве, збірае ў лесе і соліць рыжыкі, робіць настойку з грыба вясёлкі і дзеліцца фота анчоусаў уласнага прыгатавання, якія яна зрабіла з цюлькі... Спадарыня Людміла, якая калісьці ў Паставах часцавала мяне надзвычай смачным бісквітным пірагом, малюе шыкоўныя карціны і дзеліцца іх выявамі. Чырвоныя макі ў цёмна-сіняй вазе, белыя ружы ля гэткай самай белай занавескі, лебедзі ў празрыстым святле... Спадар Алесь, апантаны кніжнік, выкладвае на старонцы фота прыгажэнных нарачанскіх краявідаў, дзеліцца сваімі новымі прафесійнымі адкрыццямі — пра знойдзены інвентар Жыровіцкага манастыра, напісаны амаль пяцьсот гадоў таму на старабеларускай мове, пра тое, як «Максім Багдановіч з Яраслаўля масквічоў троліў». (Апошняе вельмі раю знайсці і пачытаць.) Яшчэ адна Людміла завяла шчанюка мопса (назвала Кексам), а Аксана нядаўна «ўсынавіла» з прытулку рудога з белымі лапкамі коціка Антона...

ЯШЧЭ (ці мне здаецца, ці насамрэч так?) менавіта ў гэты час у сацыяльных сетках сталі посціць больш цытат вядомых людзей. «Тармазіць сябе трэба на кожным кроку, і гэта павінна ператварыцца ў звычку... Чалавек без тормаза — сапсаваная машына» — з Макаранкі. «Людзі часта бываюць дурныя і ўпартыя, эгацэнтрычныя і нелагічныя. Усё роўна даруй ім. Калі ты добры, людзі будуць вінаваціць цябе ў тым, што пад маскай дабрыні ты хаваеш карыслівасць. Усё роўна заставайся добры. Калі ты дамогся поспеху, цябе будуць акружаць няшчырыя сябры і сапраўдныя ворагі. Усё роўна дамагайся поспеху. Калі ты сумленны і шчыры, людзі будуць падманваць цябе. Усё роўна будзь сумленны і шчыры. Тое, што ты будуеш гадамі, хтосьці разбурыць за адну ноч. Усё роўна будуй. Калі ты спакойны і шчаслівы, табе будуць зайздросціць. Усё роўна заставайся шчаслівы. Тое дабро, якое ты робіш сёння, заўтра людзі забудуць. Усё роўна рабі дабро. Аддай свету самае лепшае з таго, што ў цябе ёсць, і свет папросіць яшчэ. Усё роўна аддавай самае лепшае. Сябра мой, у рэшце рэшт, тое, што ты робіш, усё роўна трэба не людзям. Гэта трэба толькі табе і Богу». (Маці Тэрэза.) «Усе людзі, пасланыя нам, — гэта наша адлюстраванне. І пасланыя яны нам дзеля таго, каб мы, гледзячы на гэтых людзей, выпраўлялі свае памылкі. І калі мы іх выпраўляем, гэтыя людзі або таксама змяняюцца, або сыходзяць з нашага жыцця». (Пастарнак.) «Не гвалці душу не сваёй прафесіяй. Прафесія ад пачатку павінна быць актам любові. І ніяк не шлюбам на разліку. І, пакуль не позна, не забывайце пра тое, што справа ўсяго жыцця — гэта не справа, а жыццё» (Муракамі)...

ЯК таксама сёння на сваёй старонцы размясціла цытату з дэтэктыўнай прозы, якая нядаўна закранула: «Памыляўся Іван Карамазаў, калі сказаў: «Калі Бога няма, усё дазволена». Ніхто з цябе за подласць не спытае больш строга, чым ты сам»...

Раптам хто-небудзь, блукаючы па сонечным баку сецівa, прачытае, задумаецца і спыніцца, каб пасля з самога сябе строга пытаць не давялося.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк».

Объект продажи: изолированное помещение (назначение – помещение финансового назначения, общая площадь – 149,5 кв. м) расположено на первом этаже здания бизнес-центра «Виктория» по пр-ту Победителей, 59, пом. 3 в г. Минске.

Обременение по сделке купли-продажи объекта – условие о заключении новым собственником с ОАО «АСБ Беларусбанк» договора аренды части изолированного помещения (ориентировочно 10 кв. м), необходимой для размещения отделения ОАО «АСБ Белаусбанк» № 514/400, в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150; установка за счет средств нового собственника перегородок для выделения отделения.

Начальная цена продажи составляет 606 754,08 рубля (шестьсот шесть тысяч семьсот пятьдесят четыре рубля 08 копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 30 337,70 (тридцать тысяч триста тридцать семь рублей 70 копеек).

Открытый аукцион состоится 29.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, комната переговоров (помещение на первом этаже).

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 28.10.2020 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 601 (тел. (017) 279 46 55, (017) 279 49 30).

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 28.10.2020 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Криница» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ДЕТСКОГО САДА

(составные части и принадлежности: терраса)

с инв. № 642/С-34332 общей площадью 309,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622885000701000185 (право аренды по 20.03.2036) площадью 0,3901 га

по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Великая Раёвка, ул. Школьная, 3А.

Начальная цена с НДС (20 %) – **95 151,68 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **9 515,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **27.10.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.10.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.

УНП 100006988

Гродненское областное потребительское общество

(Дятловский филиал)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Аукцион № 3766

ЛОТ № 22460 – комплекс капитальных строений бывшей оптовой базы г. п. Новоельня:

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15203, площадью 222,0 кв. м, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, наименование – склад расфасовочный масла, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15204, площадью 1048,0 кв. м, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад кирпичный, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-12421, площадью 374,0 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – металлический склад № 2, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15226, площадью 227,0 кв. м, целевое назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – столярный цех, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-12417, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар пожарный, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15460, целевое назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15457, целевое назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – подъездной железнодорожный путь, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15. Длина пути – 928,1 м.

Площадь земельного участка, на котором располагается комплекс сооружений, – 4,2339 га, кадастровый номер 422356300002000576. Целевое назначение – для обслуживания столярного цеха, резервуара пожарного, складских помещений и подъездного пути. Право постоянного пользования. Земельный участок имеет ограничения (обременений) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,5482 га; земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3,5, площадь – 4,2339 га.

Подъездной железнодорожный путь, инвентарный номер 451/С-15457, также располагается еще на шести земельных участках (следует по ним):

• кадастровый номер 422383190602000834, площадью 0,0545 га, целевое назначение – для обслуживания железнодорожных путей, право постоянного пользования;

• кадастровый номер 422383190602000831, площадью 0,0148 га, целевое назначение – для обслуживания подъездного пути со стрелочным переводом № 1, право аренды, доля в праве – 1/2;

• кадастровый номер 422383190602000833, площадью 0,0611 га, целевое назначение – для обслуживания железнодорожных путей, право постоянного пользования;

• кадастровый номер 422383190602000829, площадью 0,0208 га, целевое назначение – для обслуживания подъездного пути со стрелочным переводом № 51, право аренды, доля в праве – 1/2;

• кадастровый номер 422383190602000832, площадью 0,0904 га, целевое назначение – для обслуживания железнодорожных путей, право постоянного пользования;

• кадастровый номер 422383190602000830, площадью 0,0192 га, целевое назначение – для обслуживания подъездного пути со стрелочным переводом № 31, право аренды.

Начальная цена продажи – 71 295,27 руб. (семьдесят одна тысяча двести девяносто пять белорусских рублей 27 коп.) с НДС.

Дата начала электронных торгов: 23.09.2020 11.30.
Дата и время завершения электронных торгов: 23.10.2020 10.30

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по адресу лота: **https://torgi.gov.by/lot/22460/3766/kompleks-kapital-nyh-stroenij-byvshej-optovoj-bazy-g-p-novoel-nya** необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел.: 8 (01563) 64581, 68130**

Организатор аукционов – государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел.: 8 (017) 200-73-33, 200-64-11**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 календарных дней с момента окончания торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора

Победитель торгов возмещает стоимость затрат на проведение аукциона согласно прейскуранту (**https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**) от фактической цены продажи лота, которая списывается с суммы внесенного Победителем аукциона задатка. Оставшаяся сумма задатка засчитывается в счет оплаты предмета аукциона. Возмещение затрат по организации и проведению аукциона Победитель осуществляет не позднее 5 рабочих дней с момента завершения торгов

Расчетный счет для перечисления задатка: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109, ОКПО: 37533622, государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»

ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ООО «БелДрев»** (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 180-4Б/2017 экономический суд Минской области будут проведены: **26 октября 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

административно-производственное здание с инв. № 400/С-16854,

назначение – здание нежилое, общей площадью 1220,4 кв. м, с составными частями и принадлежностями, расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. Коммунальная, 32А**, на земельном участке с кадастровым № 440100000002002198, в т. ч. проходная, инв. № 2100, электроснабжение здания, инв. № 2221, туалет, инв. № 1120, металлические ворота, инв. № 4000, ворота метал., инв. № 482, гаражные ворота р-р 2950*3000 мм, инв. № 4005, гаражные ворота с рамой, инв. № 4004, калитка, инв. № 481.

Начальная цена предмета торгов – 310 028,30 бел. руб. без НДС. Минимальная цена предмета торгов – 248 022,64 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 26.09.2020 г. 09.00 по 23.10.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

